Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — р. 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя месцовыя — 20 к. — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрлі пасьля тэксту 1 р. — к. За радок капітэрлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена тэксту бярэцца 10 проц. нашчоту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 25 коп. За кожны дадатковы — 15 „ Беспадстаўны і чырвонаармейцы — за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСаў—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. пунктах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЕЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 227 (2716) Пятніца, 4-га кастрычніка 1929 г.

Заключнае слова т. Гамарніка

НА АКТЫВЕ МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б 11-га ВЕРАСЬНЯ 1929 Г.

Таварышы! Я буду гаварыць вельмі каротка. Некалькі слоў аб тав. Стасэвічу. Мяне пытаюць ці ня зьвязана вызваленьне тав. Стасэвіча ад абавязкаў заг. АППА ЦК з ухілямі яго ад лініі партыі. Я павінен тут з усёй рашучасьцю заявіць, што Стасэвіч ва ўсёй сваёй рабоце ў якасьці заг. АППА праводзіў лінію ЦК і якія-б та ні былі абвінавачаньні яго па гэтай лініі ня маюць ніякіх падстаў.

Спынюся толькі на некалькіх выступленьнях. Выступаўшы тав. Мар'ясін усёй сваёй прамоваю спрабаваў вмазаць усе клясавыя выкрыўленьні, усю праваўхілісцкую практыку, тэорыю і практыку „скарыстаньня вопыту і сродкаў гандляра", у рабоце саматужна-прамысловай каапэрацыі, якія з усёй чоткасьцю выявіў апошні пленум. Ён спрабаваў паслабіць і сваю ролю ў гэтых справах, ролю былога кіраўніцтва Белсампраксаюзу. Пленум ЦК даў правільную ацэнку мінулага кіраўніцтва саматужна-прамысловай каапэрацыяй. Яшчэ дадатковыя вывады, трэба думаць, зробіць ЦКК.

Наступны тав. Шапіра. Ён згодзен з пастановамі пленуму ЦК, але патрабуе „гарантый" іх правядзеньня. На гэта я магу т. Шапіра толькі напомніць, што патрабаваньне „гарантый" партыя ўжо калісьці чула, а ад каго чула тав. Шапіра і самому будзе ня цяжка ўспомніць. Для чаго такая пастаноўка пытаньня? ЦК свае пастановы заўсёды праводзіў і праводзіць з усёй рашучасьцю. Пагэтаму слова «гарантый" або непаразуменьне, неабдуманая заява, памылка ці яшчэ што іншае. Мне-ж дазвольце прайсьці міма гэтай заўвагі, аб карэньнях якой няхай падумае сам т. Шапіра. Тав. Шапіра таксама сказаў, што карэспандэнцы ў „Комсамольскай Правде» натаўкнулі ЦК на барацьбу з правым ухілам у Наркамземе, ледзь не адчынілі нам вочы на тое, што там рабілася? Можа ў т. Шапіра толькі гэтымі днямі адчыніліся вочы. Што-ж датычыцца ЦК, дык ім барацьба з выкрыўленьнямі клясавай лініі ў Наркамземе пачалася даўно, задоўга да карэспандэнцый. Факты—Прышчэпаў быў зьняты з пасады Наркома Земляробства, Лабаноўскі выключан з партыі заразжа пасьля XII-га партзьезду, тады-ж вырашана пытаньне аб перагляздзе зямельных норм і намечан цэлы шэраг мерапрыёмстваў па забясьпечаньні нашай лініі ў рабоце зямельных органаў. Карэспандэнцы ў „Комсомольскай Правде", як я ўжо казаў, у цэлым дапамаглі справе барацьбы з выкрыўленьнямі клясавай лініі. Але казаць так як казаў тав. Шапіра, „натаўкнулі" нельга, бо гэта проста не адпавядае фактам, не адпавядае сапраўднасьці. Наўрад ці варта каму-небудзь пратэндаваць на ролю Калумбаў ужо адкрытых Амэрык. Тав. Шапіра таксама казаў—«зьнімаюць Наркома, а пасьля „сыр-бор" загараецца". І тут ня так. Справа якраз наадварот—„сыр бор" загараецца і Наркома зьнімаюць.

Цяпер дазвольце мне перайсьці да вуснай гутаркі з т. Ярухімовічам, як ён гэтага прасіў. Я павінен раней усяго агаварыцца, што, па-мойму, ён усё-ж лепш пісаў, чым сёньня гутарыў. Цяпер на сутнасьці.

Першае. Мне было пастаўлена пытаньне, чаму так доўга не адказвалі на карэспандэнцыі ў „Комсомольскай Правдзе"? „Зьвязда" цэнтральны орган партыі пядаўна ў вялікім перадавым артыкуле закрануў пытаньні, асьветленыя ў „Комсомальскай Правде". Ці позна гэта было зроблена? Па мойму не. Няўжо хто небудзь лічыць, што адказ павінен быў быць дадзен заразжа пасьля першага артыкулу—увядзеньня, ці другога, які паведамляў, што будзе працяг. Мне думаецца, што належала пачакаць канца, а пасьля ўжо пачынаць абгаварэньне. Так і зрабілі.

Другое. Тав. Ярухімовіч пытаецца, як мы адносімся да яго артыкулаў у «Комсомольскай Правде». Я на гэту тэму гаварыў у сваім дакладзе. «Комсомольская Правда» дасканалы, балвы орган камсамолу, газэта, якая ў цэлым дасканала па-бальшавіцку карыстаецца самакрытыкай, як мэтадам выхаваньня мас, умее ўзьнімаць гнеў мас супроць ухілаў ад лініі партыі, супроць скажэньня клясавай лініі, супроць усякіх гнойнікаў. Але і гэта дасканалая газэта рабіла памылкі па якія ёй своечасова было зазначана ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ і яна іх выпраўляла. Што датычыцца артыкулаў аб Беларусі, дык як я ўжо казаў мы згодны з перадавым „Зьвязды", які канстатаваў у цэлым вялікую карысьць іх, але ў той жа час адзначан і шэраг памылковых палажэньняў абмінуць якія моўчкі немагчыма. Шкада, што т. Ярухімовіч з гэтай трыбуны сам ня прызнаў шэрагу сваіх памылак, ад гэтага-б не нацярпеў гонар мундзіра карэспандэнта. Мне здаецца, што «Комсомольская Правда» павінна ў мэтах правільнай арыентыроўкі сваіх чытачоў па такому важнаму пытаньню, як нацыянальнае, паправіць шэраг памылак, дапушчаных А. І. у сваіх артыкулах.

Трэцяе. Пра некаторыя памылкі артыкулаў А. І. У першую чаргу факты.

А. І. пісаў, што мы выклікалі сюды т Кубаніна, амаль што быццам для таго, каб з дапамогай Кубаніна абвергнуць яго (А. І.) паведамленьні наконт зямельных спраў. Трэба-ж усё такі да такой штукі дадумацца! Тав. Кубанін быў запрошан намі, як член прэзыдыуму аграрнай сэкцыі Камакадэміі для кансультацыі па пытаньню аб праправоўцы новых зямельных нормаў. Работу старога кіраўніцтва НКЗ мы разграмілі дашчэнту, ацэнку яе мы далі даўно. У гэтым у нас з «Комсомольской Правдой» няма разгалосьсяў. Чаму-ж такая зусім недарэчная заўвага па пытаньні аб паездцы тав. Кубаніна. Улезе-ж такое чалавеку ў галаву, што «рыхтуецца супроць яго барацьба, мабілізуюцца сілы» і падазрэньні гатовы. Больш патрэбна было тав. Ярухімовічу спакою! Далей. У артыкулах А. І. нападзены былі ня поўныя лічбы па пытаньню аб калектывізацыі, ён падаў лічбы 12 проц. пасеўнай плошчы ў пяцігодцы, хоць павінен быў ведаць, што ў красавіку на Ўсебеларускім Зьезьдзе Саветаў было прынята 16 проц. к канцу пяцігодкі Ён таксама падаў, гаворачы аб калектывізацыі, лічбы мінулага году, адносячы іх да 1929 году і не падаў лічбаў росту калектываў у веснавую пасеўную кампанію, што моцна зьмяняе ўвесь малюнак. І гэтыя лічбы ён мог і павінен быў атрымаць. Калі-ж аддзел па рабоце ў вёсцы ЦК паслаў спраўку, выпраўляючую дапушчаныя лічбавыя памылкі, якія маюць вялікае значэньне, дык лічбы ня былі папраўлены, а зьявіліся нейкія намёкі супроць аддзелу работы ў вёсцы.

А зараз я пераходжу да шэрагу памылковых палажэньняў артыкулаў А. І. Ён пахаджэньне ўсіх правых памылак, праваўхілісцкую практыку ў Беларусі ўзводзіць да «Нашай Нівы» Усю права-ўхілісцкую практыку ён лічыць праяваю нацыянал-дэмакратызму. Гэта няправільная, памылковая ўстаноўка. Правы ўхіл, правая ідэалёгія і практыка ў нас у КП(б)Б таго-ж пахаджэньня, што і ва ўсёй УсеКП(б), ён праява дробнабуржуазнага націску на асобныя праслойкі нашай партыі, асабліва зараз у пэрыяд нашага ўздыму ў гару, па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі, пры абвастрэньні клясавай барацьбы. Ухілы ад правільнай нацпалітыкі партыі таксама зьяўляюцца праявамі правага ўхілу. Правы ўхіл у рабоце Наркамзему, выкрыўленьня клясавай лініі ўзмацнялі ў вёсцы кулака, гэту цэнтральную фігуру нацдэмакратызму, шавінізму, адсюль актывізаваўся нацдэмакратызм. Так стаіць справа, а ня так, як паставіў пытаньне А. І., які выкрыўленьні клясавай лініі ў Наркамземе выводзіць непасрэдна з нацдэмакратызму.

Далей пытаньне аб нацыянал-дэмакратычнай, шавіністычнай частцы інтэлігенцыі, аб той, якая змагалася супроць дыктатуры пралетарыяту, частка якой эмігравала, а пасьля вярнулася назад у Беларусь. А. І. ставіць справу вельмі прымітыўна. Яны, кажа А. І., «горда прайшлі міма Кастрычнікавай рэвалюцыі», перайшлі мяжу, усталяваліся на нейкі час там, а затым быццам іх прысылалі сюды назад для барацьбы супроць савецкай улады. Што датычыцца некаторых асоб, дык зусім магчыма, што яны вярнуліся сюды з такімі мэтамі ўзарваць савецкую ўладу, з шкодніцкімі мэтамі, некаторыя яшчэ зараз зьяўляюцца зьменавехаўцамі, але ўся характарыстыка А. І. у цэлым ня верна. Пытаньне больш складанае.

Расслаеньня беларускай нацдэмакратычнай эміграцыі, зьмена вехаў часткаю яе, у моц вялічэзнага размаху эканамічнага будаўніцтва Савецкай Беларусі і разьвіцьця нацкультуры, прымусілі вярнуцца сюды назад частка яе. Сярод, тых што вярнуліся, частка адыйшла ад зьменавехаўства і сумленна працуе з савецкаю ўладаю для справы сацыялістычнага будаўніцтва, другая-ж частка і зараз зьяўляецца ў «лояльнай» часамі форме ідэалёгамі барацьбы кулака і нэпмана супроць савецкай улады. Абвастрэньне клясавай барацьбы дыфэрэнцыруе і гэту групу інтэлігенцыі, ставячы адну частку бліжэй да нас, а другую больш востра супроць нас. Так стаіць справа, а не так, як падае А. І.

Адгэтуль патрабуецца з нашага боку дыфэрэнцыраваны падыход да інтэлігенцыі, адносіны пра якія я казаў у сваім дакладзе і чоткая лінія на ўзмацненьне змычкі рабочай клясы з працоўнай інтэлігенцыяй.

А. І. лічыць, што ў Беларусі ёсьць факт узмацненьня пазіцый нацдэмакратызму і што гэта выклікана недастатковым яму адпорам з боку рабочай клясы і партыі. А. І. і тут дапускае памылку. Ён дае няверную характарыстыку. Нацдэмакратызм не ўзмацніўся, а наадварот ён адступае пад нашымі ўдарамі, перад нашым наступам на клясавага ворага.

Ён слабне, але актывізуецца бароначыся і дзе-ні-дзе пераходзіць у контратаку. Ён уваходзіць складаную часткаю ў супраціўленьне кулака і нэпмана нашаму сацыялістычнаму наступу.

Цяпер на пытаньню аб прычынах актывізацыі нацдэмакратызму. А. І. лічыць асноўнай галоўнай прычынай недастатковы быццам адпор. І тут ён памыляецца. Актывізацыя выклікана нашым наступам супроць кулака, нэпмана, нацдэмакрата, шавініста. З няправільнай ацэнкі на гэтым пытаньні А. І. прыходзіць да сказу: „неабходна, каб бліжэйшы пленум да рэшткі скончыў з нацдэмакратызмам". Досыць гучна, але ня сурёзна.

Ці не адкрые нам А. І. сакрэт таго, як можна адным махам зьліквідаваць нацдэмакратызм, шавінізм, кулакоў і нэпманаў, якія зьяўляюцца іх насіцелямі. Гутарка ідзе аб рашучай барацьбе з клясавым ворагам, барацьбе складанай і нялёгкай, барацьбе якая зараз знаходзіцца на этапе свайго абвастрэньня. Вырываць карэньні капіталізму нам прыдзецца яшчэ доўга.

Партыя павінна ў сваёй барацьбе супроць клясавага ворага цьвяроза ацэньваць яго сілы і шкодныя будуць памылкі як у бок пераацэнкі, так і недааценкі клясавага ворага. Усякія моцныя, але пустыя словы ў такім пытаньні нічога, апроч шкоды, не дадуць. Ня ўсё тое золата, што бліскуць. З нацдэмакратызмам у Беларусі прыдзецца яшчэ доўга весьці барацьбу і партыя павінна быць да гэтага гатова. І ніякай самай грознай рэзалюцыяй у адзін дзень ня „зьнішчыць яго да канца".

Далей аб адносінах А. І. да т. Славіна. А. І. абмяжоўваецца агульнай заўвагай, пра некаторыя недакладнасьці ў артыкуле т. Славіна, г. зн. па сутнасьці бярэ ўвесь артыкул т. Славіна пад сваю абарону. А ў артыкуле т. Славіна былі буйныя памылкі, сярод якіх асноўная і галоўная няправільная ацэнка клясавых сіл у Беларусі.

Ці можна моўчкі прайсьці міма гэтага. Не, немагчыма. І аб гэтым трэба было сказаць выразна, чотка, поўным ротам, а не бяззуба аб «недакладных і няпоўных фармуліроўках».

На гэтым дазвольце, таварышы, мне скончыць, выказаўшы поўную ўпэўненасьць у тым, што КП(б)Б і Менская арганізацыя і ў будучым будзе з усёй рашучасьцю біць клясавага ворага, вырываць карэньні капіталізму, моцна разгортваць сацыялістычную гаспадарку і нацкультуру. Зараз трэба яшчэ з большай сілай узяцца за справу беларусізацыі, рашуча змагацца з усякім адкрытым і скрытым супраціўленьнем лініі партыі ў гэтым пытаньні. Узмацненьне барацьбы з беларускім шавінізмам не павінна паслабіць ні ў якой меры жорсткай барацьбы супроць шавінізму ўсіх масьцяў. Рускі шавінізм ёсьць, але ён хаваецца, дзейнічае цішком. Наша задача яго выкрыць, выцягваць за вушка ды на сонейка і біць па ім усё мацней. Актыўна, нашымі бальшавіцкімі, пралетарскімі рукамі правадзімая шпаркім тэмпам беларусізацыя—найлепшы сродак змычкі рабочай клясы з працоўным сялянствам, лепшая зброя ў барацьбе з усякім шавінізмам у тым ліку беларускім і рускім. Завострым-жа лепей гэту зброю і будзем усё мацней ёю біць па нацдэмакратызму. Нахай не чакаюць ад нас літасьці кулак, нэпман, нацдэмакрат, шавініст.

АБ СКЛІКАНЬНІ ПЛЕНУМУ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР.

18-ГА КАСТРЫЧНІКА Г Г. У ГОР. МЕНСКУ СКЛІКАЕЦЦА ПЛЕНУМ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР.

ПАРАДК ДНЮ НАСТУПНЫ:

1. ДЗЯРЖАЎНЫ БЮДЖЭТ БССР НА 1929-30 Г.
2. ВЫКАНАНЬНЕ БЮДЖЭТУ ЗА 1927-28 Г.

САКРАТАР БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР А. БРУШКОЎ.

Навакол савецка-ангельскіх перамоў.

Заяву Гендэрсона аб аднаўленьні зносін з СССР спаткалі воплескамі.

БРАЙТОН, 2-X. Выступаючы на зьезьдзе рабочае партыі з прамоваю аб палітыцы ўраду, Гэндэрсон сказаў. «Як вядома зьезду і нашым ворагам, мы на выборах выразна заявілі, што адною з першых спраў рабочага ўраду будзе аднаўленьне дыпляматычных зносін з Расеяй (воплескі). Я здаволен, што магу паведаміць зьезду, што ў выніку нашых перамоў дасягнута згода аб працэдуры, якая адбудзецца зараз-жа пасьля абмену паслямі (воплескі). Я думаю, што мы зрабілі крок вялікае значнасьці.

Я ўпэўнены, што як толькі будзе зроблен абмен паслямі і мэханізм дыпляматычных зносін пойдзе поўным ходам, працэдура абмеркаваньня 5-ці пытаньняў дасьць нам магчымасьць дасягнуць такой згоды, якая дасьць здавальняючы падмурак пад нашы адносіны і прывядзе абедзьве краіны да такога зближэньня, якога між імі ня было шмат гадоў".

Ангельскі друк аб посьпехах т. Даўгалеўскага.

ЛЁНДАН, 2-X. Усе газэты адгукнуліся на ўчарайшую заяву Гэндэрсона аб выніках перамоў з Даўгалеўскім. „Тайме" вынайшчае заяву Гэндэрсона поўнасьцю, але не абмяркоўвае яе.

У перадавіцы «Морнінг Пост» адзначае, што ўрад рабочай партыі „як і раней дурыць". „Гэндэрсон,—заяўляе газэта,—капітуляваў. Савецкі пасол перамог. Гендэрсон і Макданальд заверылі палату вобшчыны, што ня здарыцца той зьмены палітыкі, пра якую ціпер нам паведамляюць. Гэтае абяцаньне парушана. Для нас ужо відаць што вельмі хутка рабочаму ўраду і рабочай партыі давядзецца пашкадаваць аб гэтым кроку».

У перадавіцы „Дэйлі Тэлеграф" піша. «Сьвет можа назіраць прыемны малюнак, як савецкі ўрад дыктуе ангельскаму ўраду тыя-ж умовы, якія ангельскі ўрад нядаўна адхіліў, як непадыходзячыя.

Масква дасягнула вялічэзнае дыпляматычнае перамогі, не згадзіўшыся ні на якія ўступкі. Гэндэрсон безвяротна запэцкаў незаплямлены да гэтага часу дыпляматычны фармуляр рабочага ўраду".

З ліберальных газэт „Дэйлі Экспрэс" не абмяркоўвае заявы Гэндэрсона. „Дэйлі Кронікль" называе згоду „разумнаю" і заяўляе, што Гэндэрсон зрабіў правільна. „Нельга,—піша газэта,—як належыць праводзіць перамовы пакуль дзяржавы не размаўляюць адна з аднэю. Перш-на-перш трэба адчыніць пасольства ў Лёндане і Маскве, заснаваць зносіны і гуляць у адкрытую". Газэта думае, што палата вобшчын санкцыянуе такі парадак.

* * *

ЛЁНДАН, 2-X. Вячэрняя ліберальная газэта „Стар", абмяркоўваючы прамовы т. Даўгалеўскага і Гэндэрсона і афіцыйнае паведамленьне ангельскага ўраду аб перамовах, піша: «Гэндэрсон не павінен дазваляць кансэрватарам цярпець дарэмныя нападкі. Калі Расея сапраўды ня мае жаданьня адмаўляцца ад лёйяльных узаемаадносін з іншым сьветам, дык чым хутчэй Англія пойдзе ёй у гэтым сэнсе насустрач, ня вельмі фэадалістычна паглядзеўшы на фармальныя пытаньні, тым лепш, бо абедзьве дзяржавы ў кожным разе здолеюць лепш наладзіць дзелавыя зносіны, карыстаючыся нармальнымі ўмовамі міжнародных адносін, чымся калі Лёндан і Масква займаюцца лаянкаю на адегласьці".

УРАД МАКДАНАЛЬДА БЫЎ ПРЫМУШАН.

БЭРЛІН, 2-X. Нямецкія палітычныя колы сочаць за ходам англа-савецкіх перамоў у Лёндане з вялікаю ўважлівасьцю, тым больш, што частка нямецкага друку зусім нядаўна ацэньвала пэрспэктывы згоды вельмі скептычна. Газэты падкрэсьліваюць, што Гэндэрсон поўнасьцю згадзіўся з савецкім пунктам гледжаньня на працэдуру перамоў. Зьмену ангельскай пазіцыі газэты тлумачаць, папершае, умацаваньнем габінэту Макданальда ў выніку Гаагі, Жэневы і перамоў з Амэрыкаю, падругое, тым, што ўрад прымушан лічыцца з сваімі выбаршчыкамі, асабліва ў сувязі з сучасным зьездам рабочай партыі. Газэты ўпэўнены, што палата вобшчын адобрыць згоду.

«Бэрлінэр Тагеблят» заяўляе, што дагаворанасьць між Англіяй і СССР дасьць заспакоеньне ў палітычным становішчы Эўропы і ўмацуе яго. «З нямецкага пункту гледжаньня англа-савецкую згоду можна толькі вітаць»—заяўляе газэта.

Памёр міністр замежных спраў Нямеччыны.

БЭРЛІН, 3-X. Агенцтва Вольфа паведамляе: „Штрэзэман раптоўна памёр сёньня ўночы".

Мабілізуем усе сілы на хлебазагатоўкі.

У ходзе хлебазагатовак усё больш выяўляецца правільнасьць нашых зазначэньняў на тое, што галоўным вызначаючым ім посьпех момантам зьяўляецца рашучая барацьба з кулаком. Супраціўленьне кулака вызьлялася ўжо ў першыя дні хлебазагатовак, як працяг яго спроб сарваць сацыялістычны наступ. Рыначныя адносіны здавяліся кулаку тою галінаю, дзе яму удасца лёгка ўзьдзейнічаць па псыхалёгію дробнага вытворца тавару. Ідэалёгія кулака аказалася блізкаю да ідэй правых ухілістаў аб звароце да стыхійнага, неўрэгуляванаму рынку, і фактычным разьвязваньнем капіталістычных адносін. Стаўка кулака была пабіта. Тагды кулак перайшоў да форм адкрытага актыўнага процідзейнічаньня (якое дапаўнялася, зразумела, і затоенымі формамі ўплыву), а ў асобных выпадках, да тэрору, накіраванаму ня толькі супроць прадстаўнікоў улады, камуністаў ці рабкораў, але і супроць асноўнай масы вёскі, якую ён спрабуе запужаць і прымусіць адмовіцца ад выкананьня абавязкаў перад рабочаю дзяржаваю. Іменна такою зьяўляецца зараз контр-рэвалюцыйная падрыўная праца кулака ў тых загатоўчых раёнах, дзе і мясцовыя партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі ня здолелі ў пору мабілізаваць масы пад сваім кіраўніцтвам супроць кулака і падкулачніка

Кулак пераходзіць у контр-атаку на слабых вучастках хлебазагатоўчага фронту якраз у той момант, калі надышоў час продажу ім сваіх хлебных лішкаў. Кулак памыкаецца весьці за сабою заможную верхавіну вёскі і некаторую няўпэўненую частку сярэдняковаў. Зусім поўныя факты, якія паведамляюцца з усіх загатоўчых раёнаў, сьведчаць аб тым, што асноўныя масы сялянства даюць рашучы адпор кулацкім вылазкам і самі пераходзяць у наступ на кулака ўсюды, дзе мясцовыя кіруючыя арганізацыі забясьпечваюць на справе цьвёрдае пралетарскае кіраўніцтва. Сілы беднаты і сярэдняковаў павінны быць усюды мабілізаваны для рашучага прыдушэньня кулацкіх контр атак.

У арганізацыі загатоўчай кампаніі мы ў большасьці раёнаў давялі ці ўжо даводзім пляны да вёскі. Цяпер неабходна з усёю цьвёрдасьцю прадоўжыць гэтую працу, вызначыўшы цьвёрдыя заданьні па продажу хлеба на кулацкай і заможнай верхавіне вёскі і забясьпечыць іх выкананьне. Тут зусім нельга дапушчаць пераадміністраваньня і дачы цьвёрдых заданьняў сярэдняцкім элемэнтам. У кастрычніку ўсе цьвёрдыя заданьні павінны быць пакрыты. Ніводнага цьвёрдага заданьня не павінна заставацца да лістапада. За гэтым павінны сачыць усе арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у правядзеньні загатоўчай кампаніі. Неабходна ўвесьці батракоў, беднату і сярэдняковў у барацьбу за хлеб, мабілізаваць усе сілы вёскі для рашучага ўдару кулаку.

Уся маса вёскі павінна прымусіць кулака выканаць на працягу кастрычніка ўсе заданьні ў галіне продажу хлеба, не дазваляючы яму ісьці ні на якія манэўры і падманы, як здача тэх нічных культур, утойка лішкаў, ці продаж прыватніку. Там, дзе кулак памыкаецца дзейнічаць тэрорам, трэба напужаць яго так, каб ні яму ні іншаму не захацелася больш прадаўжаць контр-атаку. Адначасна неабходна самая ўпартая праца, каб скасаваць тэхнічныя перашкоды ў прыёмцы, хаваньні і перавозцы хлеба.

Асабліва важнае значэньне мае павялічэньне грашовых выплат па сельска-гаспадарчым падатку, самаабкладаньні, пазыках і акладному страхаваньню. Забясьпека прамысловымі таварамі зьяўляецца самым моцным рычагом хлебазагатовак, калі яна выкарыстаецца вучотам усіх патрабаваньняў клясавай палітыкі. Вопыт у гэтым адносінах ёсьць вялікі з загатовак мінулых гадоў. У адносінах усіх памянёных мерапрыёмстваў ніякі адклад больш немагчымы. Кастрычнік павінен даць значнае перавышэньне здачы хлеба, як гэта мела месца ў верасьні. Прыклад правільнага выкананьня абавязацельстваў павінен даць, перш-на-перш, сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі.

Імкненьні некаторых савгасаў пераменшыць свае таварныя лішкі павінны сустракаць адпор. Цьвёрды адпор трэба даць і тым калгасам, якія прадаюць свае лішкі прыватніку. Такія калектывы ня могуць лічыцца сапраўднымі, яны не павінны таксама мець ніякага права на дзяржаўную дапамогу. Кулацкіх кіраўнікоў гэткіх калгасаў трэба аддаваць пад суд. Уся маса калгасаў, якая выконвае сумленна свае абавязацельствы, павінны пазбавіцца ад тых, хто адыгрывае здрадніцкую ролю падкулачнікаў.

Пасьля сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ўзорам выкананьня абавязацельстваў павінна быць здача хлеба па кантрактацыі. Тут асабліва адказную зьяўляецца роля хлебнай каапэрацыі, кожная нізавая арганізацыя якой павінна працаваць як сьлед. Партарганізацыі павінны ва ўсіх пытаньнях хлебагатовак выказваць тое суровае кіраўніцтва, якога патрабуюць задачы разьвіцьця сацыялістычнага наступу і рашучага прыдушэньня кулацкіх контр-атак.

«Правда».

Адчыніўся пленум ЦКК КП(б)Б.

Учора—3-га кастрычніка адчыніўся пленум Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б. III скліканьня.

На вячэрнім сваім насяджэньні пленум прыняў наступны парадак дню:

1) Даклад прэзыдыуму ЦКК і аб рашэньнях прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) па дакладу ЦКК КП(б)Б.

2) Вынікі праверкі і чысткі вайсковых і вясковых ячэек.

3) Аб рэвалюцыйнай законнасьці і становішчы судова-сьледчага апарату Беларусі.

4) Плян працы ЦКК НКРСІБел.

Па першаму пытаньню быў заслуханы даклад старшыні ЦКК КП(б)Б тав. Калініна, па якому ў спрэчках выказаліся 5 таварышоў.

Далейшыя спрэчкі па дакладу т. Калініна перанесены на сёньня.

Адказ тав. Варашылава былому партызану Каральку.

У нашай газэце была зьмешчана заява грамадзяніна Каральк, які мае 65 год ад роду, аб накіраваньньні яго, у сувязі з апошнімі падзеямі, на КУЧ, дабраахвотнікам АДУ Чырвоную армію.

На заяву атрыман наступны адказ: „Па даручэньні тав. Варашылава, паведамляю, што задаволіць просьбу грамадзяніна Каралька аб залічэньні яго добраахвотнікам у шэрагі Асобнай Дальня-Ўсходняй Чырвонай армії немагчыма. Пры першай патрэбе (пачатак вайны) ён будзе залічан у гэткую. Па даручэньні Шапачнік".

СЁНЬНЯ ВЫШАЎ ПЕРШЫ НУМАР ГАЗЭТЫ „ПІАНЭР БЕЛАРУСІ".

Маладому барацьбіту за новага сацыялістычнага чалавека—газэце піанэраў і школьнікаў «Піанэр Беларусі" шчырае пралетарскае прывітаньне.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне дзяцей, уцягненьне піанэраў і школьнікаў у справу сацыялістычнага будаўніцтва, барацьба са шкодныімі дробна - буржуазнымі ўплывамі на маладое падрастаючае пакаленьне, баявое рашучае вырашэньне задач рабочае клясы і камуністычнае партыі ў дзіцячых арганізацыях—вось чарговыя лёзунгі на тым сьцягу, пад якія павінна весьці працу газэта „Піанэр Беларусі" Жадаем лепшых посьпехаў у справе разгортваньня працы газэты „Піанэр Беларусі".

Рэдакцыя газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".

ДА ВЫХАДУ УСЕБЕЛАРУСКАЙ ГАЗЭТЫ ПІАНЭРАЎ І ШКОЛЬНІКАЎ.

Сёньня выходзіць усебеларуская газэта піанэраў і школьнікаў. Выхад газэты мае вялікае палітычнае значэньне і зьяўляецца вялікай заваёвай партыі і камсамолу ў справе ўзмацненьня камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Якія асноўныя задачы павінна вырашыць усебеларуская газэта піанэраў і школьнікаў?

Партыя вядзе рашучае сацыялістычнае наступленьне на клясавага ворага. У адказ на гэта клясавы вораг шалёна супраціўляецца і напружвае сілы, каб перашкодзіць будаўніцтву сацыялізму. Клясавы вораг робіць спробы аўладаць маладым падрастам пакаленьнем. Вось чаму газэта павінна ня толькі паказваць твар клясавага ворага, але пабаявому весьці рашучую барацьбу супроць клясавага ворага, які арганізуе свае шчупальцы да дзяцей рабочых і сялян. Газэта павінна змагацца супроць прасякненьня ў дзіцячае асяродзьдзе буржуазна-нэпманаўскай ідэалёгіі. Газэта павінна ахапіць камуністычным уплывам усю дзетвару.

Меначта, вызначаючы гэту задачу, газэта зьявіцца буйнейшым арудзьдзем партыі і камсамолу ў справе камуністычнага выхаваньня дзяцей, выхаваньня новага сацыялістычнага чалавека.

Газэта павінна весьці рашучую барацьбу са ўсякім шавінізмам, узмацняючы інтэрнацыянальнае выхаваньне ў піанэрскай арганізацыі сярод усёй детвары, больш прыцягваючы нашу арганізацыю да міжнароднага дзіцячага руху, да барацьбы партыі і камсамолу і рабочае клясы ўсяго сьвету.

Савецкі Саюз перажывае бурнае сацыялістычнае будаўніцтва. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі напружвае ўсе сілы на выкананьне 5-цігодавага плану сацыялістычнага будаўніцтва. Задача піанэрскай арганізацыі—уцягнуць усіх піанэраў, усіх дзяцей у барацьбу за выкананьне 5-цігодкі, штодзённа дапамагаючы партыі і камсамолу ў сацыялістычным будаўніцтве. Газэта павінна своечасова і пабаявому высоўваць канкрэтныя лёзунгі барацьбы на розных вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Задачы партыі і камсамолу газэта павінна перавесьці на канкрэтныя практычныя справы, зрабіўшы іх зразумелымі і даступнымі кожнаму піанэру і школьніку.

Газэта павінна арганізаваць усю масу дзетвары навакол задач партыі і камсамолу і дапамагчы выканаць пастанову 6 усесаюзнай канфэрэнцыі аб павялічэньні ў два разы шэрагаў піанэрскай арганізацыі.

Зусім ясна і тое, што мы павінны ў бліжэйшы час дабіцца рашучага пераходу ўсёй арганізацыі на работу пановаму. Гэты пераход можа быць пасьпяховым, калі будзе найшырэйшы абмен паміж зьвенямі, атрадамі, школамі, арганізацыямі. Газэта, арганізуючы абмен усяго каштоўнага вопыту піанэрскай арганізацыі і школьнікаў, павінна рашуча выступіць на барацьбу з недахопамі, якія ёсьць у атрадзе, школе, у кіраўніцтве арганізацыяй, на падставе РАЗГОРТВАНЬНЯ САМАКРЫТЫКІ.

Пры ўмове цьвёрдага і штодзённага кіраўніцтва камсамолам піанэрарганізацыяй газэта павінна дапамагчы піанэрам стаць гаспадарамі сваёй арганізацыі, уцягнуць усіх піанэраў у актыўную работу атраду і зьвеньняў. Выконваючы гэтую задачу, газэта зьявіцца буйнейшым арудзьдзем палепшаньня ўсёй работы піанэрскай арганізацыі і школ.

Слабым месцам у піанэрскіх атрадах зьяўляецца нацыятаньне (у галіне беларусізацыі), асабліва ў горадзе. Тут мае месца разрыў паміж школай і атрадам. Выхад усебеларускай газэты (на беларускай мове) павінен адыграць вялікую ролю ў справе ўзмацненьня беларусізацыі ў піанэрскай арганізацыі.

Перад газэтай стаўвіцца вялікія палітычныя задачы.

Калі газэта будзе карыстацца актыўным падтрыманьнем з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці і перш за ўсё з боку самога камсамолу, калі самі дзеці стануць актыўнымі будаўнікамі газэты, калі газэта будзе ўласнасьцю шырокіх дзіцячых мас Беларусі,—выканаць пастаўленыя задачы будзе зусім магчыма.

Газэта будзе выходзіць два разы ў тыдзень. Кошт яе—10 кап. у месяц.

Не чакаючы абежнікаў, трэба зараз-жа прыступіць да павуляризацыі газэты. Кожнае зьвяно, група школы павінны прыступіць да арганізацыі падпіскі на ўсебеларускую газэту піанэраў і школьнікаў.

Выхад газэты „Піанэр Беларусі" зьяўляецца лепшай рэалізацыяй вынікаў піанэрскага зьлёту. Газэта павінна адыграць вялікую ролю ў далейшым разьвіцьці піанэрруху на Беларусі.

Забясьпечым усебеларускай газэце піанэраў і школьнікаў актыўнае падтрыманьне.

А. РЫВІН.

Рэвалюцыйны рух у Кітаі.

Камуністычнае войска ідзе наперад.

ШАНХАЙ, 2-X. Згодна паведамленьня аг. Тачун, улада Амою вельмі занепакоена весткаю аб захопе камуністычнымі атрадамі значнай колькасьці амуніцыі і аб разброеньні імі брыгады фуцзянскага войска пры захопе гарадоў Упін і Шанан. У Амоі баяцца, што мясцовых сіл у паўднёвым Фійдз

ЦЫРКУЛЯРНА

Пра садзейнічаньне хлебазагатоўчай кампаніі 1929-30 г.

УСІМ АКРУГОВЫМ ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭТАМ БССР.

Аспоўнымі задачамі новай хлебазагатоўчай кампаніі зьяўляецца: поўны ахоп усіх таварных лішкаў хлеба індывідуальных сялянск. гаспадарак; выкананьне гадавога пляну хлебазагатовак па БССР да 1 лютага 1930 г.; поўная здача аспоўным хлебазагатавіцелям усіх таварных хлебных лішкаў калгасаў, савгасаў; поўнае ўзысканьне ад кантрактоўшчыкаў усяго захантрактаванага зярна, поўнае ўзысканьне ў вызначаныя тэрміны ўсяго памольнага збору.

Улічваючы запатрабаваньні бядняцка-серадняцкіх мас вёскі аб ужываньні цьвёрдай і яскравай плянавасьці пры правядзеньні хлебазагатовак і выходзячы з вопыту мінулага году, гадавы плян хлебазагатовак павінен быць ужо з самага пачатку кампаніі даведзен да паасобных населішчаў.

Выкананьне паказаных задач ускладае асаблівую адказнасьць на ўсе савецкія і хлебазагатоўчыя апараты, патрабуючы максымальнай напружанасьці ўсіх сіл з боку ўсіх арганізацый, і выклікае неабходнасьць удзяленьня хлебазагатоўкам той асаблівай увагі і той энэргіі, якія выклікаюцца вялізарнай важнасьцю новай хлебазагатоўчай кампаніі.

У сувязі з гэтым, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР прапануе ўсім акруговым выканаўчым камітэтам:

1. Забясьпечыць правільнае прыняцьце райёнамі і сельсаветамі хлебазагатоўчых пляноў, зацьверджаных органамі НК Гандлю, спыняючы ўсялякія тэндэнцыі да памяншэньня іх.

2. У мэтах правільнага разьмеркаваньня плянавых заданьняў па хлебазагатоўках паміж паасобнымі населішчамі, зьвярнуць увагу на тое, каб гэта разьмеркаваньне грунтавалася-б на высьвятленьні таварных лішкаў хлеба паасобнай вёскі на падставе вестак аб канкрэтных асаблівасьцях кожнага населішча і розных ступенях таварнасьці паасобных сацыяльных груп сялянства.

Кіраваньне працай па высьвятленьні лішкаў хлеба па населішчах павінна быць ускладзена на райённыя выканаўчыя камітэты з прыцягненьнем сельсаветаў, сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, статыстычных сіл, фінансавых і зямельных органаў, каапэрацыі, хлебазагатоўчых арганізацый і з абавязковым удзелам груп беднаты і батрацтва кожнай вёскі.

3. Ажыцьцявіць практычную праверку фактычнай падрыхтаванасьці хлебазагатоўчага апарату для тэхнічнай прыёмкі хлеба і ўсіх мер, праведзеных для забясьпечаньня нармальнай прыёмкі (штаты, склады, тара, пуркі і інш.).

4. Удзяліць асаблівую ўвагу забясьпечаньню тэрміновага і датэрміновага выкананьня кантрактоўшчыкамі ўсіх сваіх дагаворных абавязацельстваў і своечасоваму прыняцьцю мер супроць няздатчыкаў.

5. Забясьпечыць хуткі абмалот і здачу сваіх хлебных таварных лішкаў саўгасамі і калгасамі, якія абавязаны паказаць прыклад усяму сялянству ў галіне выкананьня абавязкаў перад савецкім урадам.

6. Арганізаваць сыстэматычнае садзейнічаньне арганізтаванаму правядзеньню хлебазагатовак, шляхам максымальнага павышэньня актыўнасьці хлебазагатавіцеляў і асабліва шляхам шырокай мабілізацыі ўвагі савецкага апарату і ўсёй вясковай грамадзкасьці да выпатаньняў хлебазагатовак.

7. Адначасова забясьпечыць своечасовы і датэрміновы збор усіх грашовых плацяжоў, устаноўленых Урадам, пратэрмінаваных ссуд і абавязацельстваў з боку сялянства, фарсіраваць збор паявых узносаў па лініі каапэрацыі.

8. Зьвярнуць увагу на суровае ўжываньне дысцыпліны па хлебазагатоўках, не дапушчаючы пераплат, рашуча спыняць усялякае праяўленьне ажыятажу і канкурэнцыі паміж загатавіцелямі і прымаць самыя энэргічныя меры да ліквідацыі гэтых выпадкаў.

9. Садзейнічаць хлебазагатоўчаму апарату ў справе перабросі і разьмяшчэньня на адпаведных складах хлебных рэсурсаў.

10. Спэцыяльную ўвагу ўдзяліць пытаньням памольнага збору і арганізацыі грамадзкага кантролю за выкананьнем млынамі сваіх абавязкаў, шляхам уцягненьня ў гэтую справу груп беднаты і батрацтва.

11. У сувязі з пасіленьнем таварнага снабжэньня вёскі для стымуляваньня загатовак, належыць ажыцьцявіць нагляд за тым, каб прамысловыя тавары фактычна былі выкарыстаны ў якасьці магутнага фактара пасіленьня здачы хлеба.

Для гэтага неабходна, каб таварная маса, вызначаная для вёскі, фактычна пайшла іменна туды, а не асела-б у горадзе, і каб стымуляваньне прамтаварамі ўтаралася-б незалежна ад таго, якому хлебазагатавіцелю здадзен хлеб.

12. У мэтах штодзённага сыстэматычнага садзейнічаньня хлебазагатоўкам і ўсебаковага падтрыманьня ініцыятывы грамадзкіх арганізацый у гэтай галіне, належыць прыняць адпаведныя меры да таго, каб пры сельсаветах былі арганізаваны камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам.

Вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

За сэкратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.

28 верасьня 1929 г.
г. Менск.

У Саюзных Рэспубліках.

Супроць правакацый дэлегатаў-„гарнякоў".

АРЦЁМАЎСК. Паведамленьне ТАСС аб пакалённых і антысавецкіх выступленьнях у ангельскім друку і на рабочых сходах „гарнякоў" Крэйна і Рума, пасланых у СССР сваімі ўласьнікамі капальняў, выклікала абурэньне ўсіх рабочых Арцёмаўскай акругі.

Гарнякі капальні «Мар'я» і шэрагу гарлоўскіх руднікоў, дзе Крэйн—Рум разам з Саўтанам выступалі на сходах, называюць іх інфармацыю аб СССР здрадніцтвам і правакацыяй. Рабочыя адзначаюць пры гэтым, што выступленьне гэтых наймітаў ангельскіх уласьнікаў капальняў перад арцёмаўскімі гарнякамі востра розьніцца ад таго, што яны гавораць зараз ангельскім рабочым. У Арцёмаўску, напрыклад, на рабочым сходзе ангельскія „гарнякі" заявілі, што СССР зрабіў на іх вельмі добрае ўражаньне.

Газэта „Качагарка" агалашае лісты, пакінутыя Крэйнам, Румам і Саўтанам перад выездам з Арцёмаўску. У лістох яны вельмі прыхільна адзываюцца аб Чырвонай арміі і савецкіх дамох адпачынку і выказваюць жаль, што ў Англіі няма такіх дамоў адпачынку для рабочых.

Праграма выканана на 109 процантаў.

ЛЕНІНГРАД, 28-9. Рабочыя машынабудаўнічага заводу імя Карла Маркса пастанавілі скончыць бягучы гаспадарчы год рапартам усёй рабочай клясе СССР праз цэнтральны орган „Правда" аб сваіх дасягненьнях і задачах будучага гаспадарчага году.

Пасьля папярэдняй прапрацоўкі ЦК, на агульна-завадзкім мітынгу прыняты адкрыты ліст усім заводам і фабрыкам СССР. Завод мае значныя дасягненьні за мінулы год. Праграма выканана на 109 проц., зьніжэньне сабекошту, замест 9 проц. па заданьню, складае 13 проц.

Палёгка прыватніку за хабар.

ІВАНА-ВАЗЬНЯСЕНСК, 1-X. Чыстка Іванаўскага фінаддзелу выкрыла сувязь групы працаўнікоў падатковага аддзелу з прыватнікамі. Прадпрыемствы прыватнікаў не кантраляваліся на працягу шэрагу гадоў. Недаападаткаваньне прыватнікаў за апошніх 2 гады дасягае сотняў тысяч рублёў. Падатковыя працаўнікі за хабар зьмяншалі падатак прыватніку. Гэтыя сумы дасягнулі 127 тысяч рублёў. Інспэктары бралі хабар грашыма і натураю і хадзілі да прыватнікаў у госьці. 17 хабарнікаў і прыватнікаў арыштавана. Вядзецца дазнаньне.

Чырвоны Людарвай.

МАСКВА, 2-X. Усёй савецкай грамадзкасьці вядома вёска Людарвай, Ніжагародзкага краю пасьля паказальнага суду над мясцовымі кулакамі, якія наладзілі лупцоўку беднаты. Гэтымі днямі прэзыдыум ЦВК атрымаў прывітаньне ад сходу вёскі Людарвай. У гэтым прывітаньні паведамляецца аб пастанове працоўнага сялянства Людарваю перайсьці ўсёю вёскаю ў калгас. Калгас будзе называцца „Чырвоны Людарвай".

Паход за ліквідацыю няпісьменнасьці.

КАЗАНЬ, 29-9. У сувязі з распачатым культпаходам за ліквідацыю няпісьменнасьці, учора ў Казані адбылася шматтысячная дэманстрацыя студэнцтва, чырвонаармейцаў і піанэраў. Дэманстранты ў сваіх лёзунгах патрабавалі рашучага ўзмацненьня барацьбы з некультурнасьцю, невуцтвам і пагалоўнага навучаньня грамаце.

Піанэры і вучні рашуча патрабуюць спыненьня п'янства і зьмяншэньня выпуску гарэлкі.

Пралетарыят у барацьбе з буржуазеяй.

Лёкаут 350-ці шофэраў.

ПАРЫЖ, 2-10. У адказ на дэманстрацыйную забастоўку парыскіх шофэраў паштовых аўтамабіляў, прыватныя прадпрыёмцы са згоды паштова-тэлеграфнай адміністрацыі абвясьцілі лёкаут 350-ці шофэрам, замяніўшы іх на паліцэйскіх і асобных штрэйхбрэхераў. Гэты захад быў ужыты не зважаючы на абяцаньні, дадзеныя прадстаўніком пошт і тэлеграфаў ня ўжываць ніякіх рэпрэсій у адносінах да бастуючых, пакуль ня вырашыцца канфлікт.

На агульным сходзе лёкаутаваных прадстаўнік міністэрства прапанаваў рабочым неадкладна распачаць працу, аднак не гарантаваў прыёму на працу ўсіх зволеных рабочых. Сход адхіліў прапанову міністэрства і ўхваліў прадаўжаць барацьбу да поўнага задаволеньня патрабаваньняў бастуючых, г. зн. прыёму на працу зволеных, павялічэньня заработку і адмовы ад рэпрэсій у адносінах да ўдзельнікаў забастоўкі.

Унітарны саюз паштовых служачых зьвярнуўся да ўсіх сяброў саюзу з заклікам выступіць на абарону лёкаутаваных.

2 забітых і шмат параненых.

НЬЮ-ЁРК, 2-X. У Марыёне (штат Паўночная Караліна) аб'яднаны саюз тэкстыльшчыкаў ізноў абвясьціў забастоўку з прычыны адмовы прадпрыёмцаў залічаць на працу актыўных удзельнікаў забастоўкі мінулых месяцаў.

У сувязі з сутычкаю, якая здарылася між стачачнікамі, штрэйхбрэхерамі і паліцыяй, якая выступіла па дапамогу штрэйхбрэхерам, забіта двое тэкстыльшчыкаў, двое ледзь жыве і 12 цяжка паранена. Пацярпела таксама двое паліцэйскіх.

Каб перамагчы, патрэбна сталёвая адналітасьць.

ВЕНА. У „Ротэ Фане" агалошана рэзалюцыя супроць правага ўхілу, аднагодна ўхваленая на пасяджэньні пашырэнага пленуму ЦК аўстрыйскай кампартыі. У рэзалюцыі зазначаецца, што абвастрэньне клясавых супярэчнасьцяў Аўстрыі і спроба буржуазеі выйсьці з становішча праз абвяшчэньне фашысцкай дыктатуры выразна гавораць аб тым, наколькі нятрывалаю і трухляваю зьяўляецца стабілізацыя капіталізму. Сацыял-фашысцкая роля сацыял-дэмакратыі асабліва пуката выявілася іменна ў Аўстрыі. Гэтак сама ў Аўстрыі асабліва адбілася радыкалізацыя рабочае клясы.

У сувязі з гэтым ЦК высунуў, як бліжэйшую задачу кампартыі, падрыхтоўку ўзброенай барацьбы супроць фашызму і пастаноўку пытаньня аб барацьбе за ўладу. Пленум падкрэсьліў, што ўсе адзначаныя зьявішчы сьведчаць аб правільнасьці пэрспэктыў, намечаных X пленумам Выканкому Камінтэрну. Пленум ЦК аўстрыйскай кампартыі далей зазначыў, што ўмоваю выкананьня ўзьнятых перад партыяй рэвалюцыйных задач зьяўляецца барацьба супроць адкрытых апартуністычных плыняў унутры партыі.

Пленум прызнаў, што абарона поглядаў асоб, якіх зганьбіў Камінтэрн, у сувязі з іх антыпартыйнасьцю і крайняй варожасьцю інтарэсам пралетарскага рэвалюцыйнага руху, ня можа сумяшчацца з прыналежнасьцю да камуністычнай партыі. З гэтае прычыны пленум усклаў на палітбюро абавязак падрыхтаваць правядзеньне партыйнай чысткі, звольніць з партыі права-апартуністычныя элемэнты і прапанаваць усім прымірэнцам выказаць свае адносіны да лініі партыі, у іншым разе — ужыць супроць іх дысцыплінарныя захады.

Адстаўка эгіпецкага ўраду.

ЛЁНДАН, 5-X. Эгіпецкі ўрад падаўся ў адстаўку.

* * *

ЛЁНДАН, 2-X. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Каіру: «З 15-ці эгіпецкіх габінэтаў, якія зьмяніліся на працягу апошніх 10-ці гадоў, падаўшы ў адстаўку ўрад Махмуд-пашы заставаўся ва ўладзе больш за ўсіх—463 дні. Намесьнікам Махмуд-пашы, як відаць, будзе ўрад, складзены з прадстаўнікоў партыі Вафд (буржуазная нацыяналістычная партыя).

Цэнтральнаю праблемаю зьяўляюцца выбары, у выніку якіх павінны быць адобраны новыя асновы англа-эгіпецкага ўгавору».

БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБОЙ выкарчуем практыку апартунізму.

Камуністы віцебскага гарадзкога камітэту ўзаемадапамогі папалі ў палон нэпманаў і гандляроў. Беларускае аддзяленьне Продасілікату крэдытуе прыватніка і дае яму дэфіцытныя тавары. У Чэрыкаўскім РВК кулакі ў пашане.

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА АПАРТУНІСТЫХ І ІХ ПРЫХІЛЬНІКАХ.

Рэзалюцыі гучныя, а справы апартуністычныя

Гэтымі днямі ЦКК РСІ азнаёмілася з Віцебскім Гарадзкім Камітэтам Узаемадапамогі, дзейнасьць якога ўяўляе сабой яскравы прыклад правага ўхілу на практыцы, выкрыўленьня клясавай лініі і безгаспадарчасьці, ня гледзячы на тое, што на чале камітэту сталі камуністы.

У чым-жа выяўляецца дзейнасьць Віцебскага Гарадзкога Камітэту Узаемадапамогі?

Калісь існавалі ў гарадох рэлігійна-філянтрапічныя арганізацыі, на чале якіх стаяла яўрэйскае духавенства, якое пад фірмаю дапамогі імкнулася выхоўваць яўрэйскую беднату ў духу рэлігіі, замазваньня клясавай барацьбы, паважаньня купцоў і эксплёататараў, а значыцца, і ўзмацненьня царскай улады. І як ні дзіўна, Віцебскі Гарадзкі Камітэт Узаемадапамогі на працягу апошніх 1 з палов.—2-х гадоў мала чым адрозьніваўся ад вышэй апісаных буржуазных арганізацый.

Досыць толькі адзначыць, што нядаўна ў гэтым таварыстве побач з яўрэйскімі беднякамі зьяўляліся членамі былушыя гандляры—65 чал., сучасныя гандляры—91 чал., служыцелі рэлігійных культаў—8 чал., б. паліцэйскіх і іншых—11.

Замест таго, каб у асноўным ставіць перад сабою вытворчыя мэты, уцягненьне яўрэйскай беднаты ў вытворчыя с.-г. і прамысловыя арцелі, каапэраваньне яе, Камітэт Узаемадапамогі праводзіў галоўным чынам тую-ж філянтропію, што і раней рэлігійныя арганізацыі. За 50 кап. штомесячных членскіх узносаў давалася дарымовая модыцынская дапамога, хлебныя карткі, ільготныя дровы ня толькі беднаку, а былушым і сучасным гандляром і эксплёататарам. І гэта праводзіцца тады, калі партыяй і савецкай уладай даюцца выразныя дырэктывы аб клясавай барацьбе, клясавай палітыцы і г. д.

Магчыма, што ў сябры таварыства ўзаемадапамогі клясавы вораг пралезьдзякуючы нягоднаму статуту таварыства, а статут сапраўды з праваўхіліцкім духам. А як-жа абстаіць справа з выбарным органам—камітэтам? Наконт гэтага маюцца суровыя дырэктывы, што ў выбарны орган асобы, належачыя да эксплёататараў у мінулым, не гаворачы аб сучасных, ні ў якім разе абраны быць ня могуць. Але-ж гэтыя дырэктывы (ды і ня толькі дырэктывы, а і савецкія законы) не абавязковы чамусь та ні для самога камітэту, ні асабліва для тых партыйных і савецкіх арганізацый, якія кіравалі выбарамі камітэту.

Як вам падабаецца такі малюнак? Побач з старшынёю камітэту рабочым-вылучэнцам, камуністам Шнэйвасам, быў абраны намесьнікам старшыні буйны эксплёататар, пазбаўлены выбарчых правоў Каварскі, членамі прэзыдыуму камітэту побач а камуністамі засядаюць былушыя гандляры Парцін, Рыўлін.

Дзе-ж былі партыйныя арганізацыі г. Віцебску, пачынаючы з партячэйкі і канчаючы Віцебскім АК КП(б)Б, у прывітаньні яўрэйскае бюро АК КП(б)Б? Чаму яны своечасова не сыгналізавалі аб гэтых зьявішчах, не давалі рашучага адпору такім фактам скажэньня клясавай лініі? Трэба аддаць справядлівасьць, што некаторыя з іх слухалі даклад аб дзейнасьці камітэту, прымалі агульныя рэзалюцыі, але-ж ня прымалі практычных мер для зьнішчэньня гэтых агіднасьцяў.

З боку сумленных беспартыйных працаўнікоў былі спробы, карыстаючыся лёзунгам самакрытыкі, выкрыць злачынную дзейнасьць камітэту. Але там, дзе скажаецца клясавая лінія, самакрытыка ў загоне. Кіраўнікі камітэту ўсімі спосабамі стараліся паралізаваць крытыку, скампрамэтаваць асоб выступаючых з крытыкай, прыгнятаць іх. Аб мытарствах аднаго з такіх пасьпеўшых за крытыку прыдзецца расказаць у другі раз.

П. П.

Беларускае аддзяленьне Продасілікату тварам да... прыватніка

ДЭФІЦЫТНЫЯ ТАВАРЫ, КРЭДЫТЫ, УВАГА ПРЫВАТНІКУ І СПЭКУЛЯНТУ. ПРЫВАТНІК АТРЫМОЎВАЕ ТАВАР У МЕНСКУ, А МЕНСЕЛЬПРОМУ ПРЫХОДЗІЦЦА ЗАВОЗІЦЬ З РСФСР

На рагу вуліцы Савецкай і Энгельса кожнаму прахожаму кідаецца ў вочы вялікая шыльда:

„Белорусское отделение Продасиликата".

На вокнах адзяленьня выстаўлены вельмі прыгожыя рэчы шкляной прамысловасьці. Адным словам надворны выгляд аддзяленьня вабіць да сябе прадстаўніка каапэратыўнай арганізацыі, выпадковага прахожага-рабочага і служачага.

Ці ўсё так прыгожа і ўнутры самаго аддзяленьня продасілікату? Аб унутраным зьмесьце прыгожай арганізацыі мы і зьбіраемся гаварыць. Уласна кажучы, мы хочам пагаварыць з самім кіраўніком аддзяленьня партыйцам т. Ваксманам.

Папершае, тав. Ваксман, дазвольце вам перадаць шчырае прывітаньне ад прыватных гандляроў Гомелю, Баброўску, Віцебску і іншых гарадоў БССР. Разам з прывітаньнем гандляры Мазіп, Геніна, Млодзік, Розэнбаум і іншыя дасылаюць вам, т. Ваксман, вялікую ўдзячнасьць за цёплыя адносіны да іх з боку вашага аддзяленьня.

Прыватнікі гандляры вельмі ўдзячны кіраўніку «Продасиликату» за падтрыманьне іх у барацьбе на рынку з каапэрацыйнымі арганізацыямі.

Гэтыя «прыемныя» людзі кажуць, што яшчэ можна жыць на сьвеце, бо ў Менску ёсьць наш «партыец» Ваксман.

Вам патрэбны факты, калі ласка, пачынаем.

Беларускае аддзяленьне Продасілікату праводзіць забясьпечаньне таварамі прыватнікаў, нават больш таго забясьпечвае іх і дэфіцытнымі.

Можа т. Ваксман вам прыдзе на памяць гісторыя з Менсельпромам. Памятуеце, Менсельпром скардзіўся, што вы дэфіцытныя тавары вывозіце з Менску і адначасова забясьпечваеце імі прыватнікаў, а Менсельпрому гэтыя дэфіцытныя тавары прыходзіцца завозіць з РСФСР.

Калі пакапацца ў кнігах аддзяленьня, дык там знойдзуцца факты, за якія так удзячны гандляры...

Калі вам цяжка, дык мы вам раскажам, як па вашых рэзалюцыях крэдытаваліся прыватнікі-гандляры. Возьмем да прыкладу гр. Млодзіка з Магілеву, Ліўшыца з Менску, Геніна з Бабруйску, Мазіна з Гомелю. Досыць, хопіць і гэтых. Пералічаным прадстаўнікам прыватнага, варожага нам сэктару вы адпускалі ў крэдыт тавары на сумы ад 200 да 500 руб. і на тэрміны ад 75 да 90 дзён...

Нам хочацца таксама пагаварыць і аб Віцебскай гандлёвай фірме „Урьев, Розенбаум і К-о". Гэтыя гандляры чамусь карысталіся асаблівай прыхільнасьцю кіраўніка аддзяленьня Продасілікату. Сапраўды, чым ня прыхільнасьць? Хутка канчаецца два гады, а з гандляра Ур'ева не спаганяюцца грошы за апратэставаны вэксаль. Больш таго, у адсутнасьць свайго намесьніка, тав. Ваксман адказнага кіраўніка фірмы „Ур'еў, Розэнбаум і К-о" прызначае на працу ў аддзяленьне на пасаду вяжора.

Магчыма т. Ваксман разважаў, што такім чынам будзе лепш спагнаць з прыватніка запазычанасьць, магчыма і іншыя дыплёматычныя хітрыкі былі падставай для прызначэньня Ур'ева вяжорам.

Не пасьпеў, як гаворыцца, Ур'еў абагрэцца ў Беларускім аддзяленьні Продасілікату, як ён накіроўваецца ў камандыроўку на завод «Волхов» на ст. Чудова Кастрычнікаўскай чыгункі для адгрузкі тавараў Смаленскаму агэнцтву Продасілікату.

„Не жизнь, а масленица" зараз былому гандляру Ур'еву: езьдзіць па камандыроўках, атрымоўвае куртажныя і процанты, а галоўнае з „праклятымі" фінінспэктарамі ўжо ня прыдзецца псаваць сабе нэрвы.

А як-жа з апратэставаным вэксалем?

— Што за „счеты" паміж прыяцелямі, абы РСІ не заглянула.

А заглянуць трэба, ох як трэба.

Можна прывесьці яшчэ з парачку фактаў арганізацыённых няўвязак; якім-ся чынам 30 руб., атрыманыя Ваксманам з Ур'ева ў рахунак вэксалю яшчэ ў сьнежні 1928 году, дагэтуль не праведзены па кнігах аддзяленьня. Авансы сабе і служачым выдаюцца направа і налева.

З Масквы яшчэ ў красавіку атрымана 2 вагоны аптэчнага шкляного начыньня, але яно і дагэтуль хаваецца на гарадзкой станцыі чыгункі.

Можна было-б яшчэ крыху з вамі т. Ваксман, пагутарыць, але думаем, што хопіць. Тым больш хопіць, што зараз з вамі па душах пагавораць у адпаведных органах па справе дапамогі нэпманам.

В. Зайцаў.

Там, дзе кулак у пашане.

На старонках нашай газэты досыць пісалася аб клясавай сутнасьці сельска-гаспадарчага падатку. Але на вялікі жаль і сёлета мы маем цэлы шэраг выкрыўленьняў, ня гледзячы на лепшую ў асноўным падрыхтоўку да правядзеньня гэтай кампаніі.

Яскравым пацьвярджэньнем гэтага зьяўляюцца некаторыя факты з Чэрыкаўскага гарсавету. Пры вучоце аб'ектаў абкладаньня некаторыя кулакі пастараліся ўтоіць частку аб'ектаў абкладаньня і прыбыткаў гаспадаркі. Так, напрыклад, вядомы кулак Сенька Паштанценак пляменьнік вядомага абшарніка — палкоўніка Парфяленка, пастараўся ўтоіць тры з паловаю дзесяціны зямлі, якая нібы лічыцца на імя яго дачкі, якая ўжо тры гады як памёрла. Ня ўлічаны шмат маргоў і гародаў, якія ён накупляў у розных беднякоў. Гэтыя маргі і гароды складаюць ня менш сямі дзесяцін. Ня ўлічан прыбытак ад саламарэзкі і малатарні, якія круглы год даюць вялікі прыбытак у гаспадарцы і дэлы шэраг іншых крыніц прыбытку досыць буйнай кулацкай гаспадаркі. Гэта толькі адзін прыклад з многіх.

Калі праходзіла індывідуальнае абкладаньне, дык нарада актыву і група беднаты ўносіла прапанову аб індывідуальным абкладаньні кулакоў падобных Сеньку Паштанценку. Але што мы бачым? Голас беднаты ня ўзят пад увагу. Такія кулакі як: Сенька Паштанценак, Сургучовы Тодар і Васіль (першы былы стражнік) фіктыўна падзяліўшыя гаспадарку, а ў сапраўднасьці жывуць і працуюць разам; Васіль Ананіч, які мае шмат зямлі, а дзеля фіктыўнасьці запісвае гэту зямлю на свайго зяця Падабеда Мікалая, якога зусім у Чэрыкаве няма, ён дзесьці служыць; вядомы кулак Анісім Егоры, пан Дуброўскі—царскі чыноўнік, якога выкінулі з савецкай установы пасьля рэвалюцыі за гістарычныя заслугі па рабоце ў охранцы, зараз актыўны член царкоўнага савету, які ня кажучы аб гаспадарцы і заработках, мае вялікія прыбыткі ад свайго панскага дому—усе яны не абкладзены індывідуальным падаткам. Чэрыкаўская беднота гэтым вельмі абурана і ніяк ня можа сабе ўявіць, чаму кулаччо прыкрываюцца нізавымі зьвеньнямі савецкай улады. Беднота стогне, а кулакі сьмяюцца, ды яшчэ больш насядаюць на беднату.

Але прычына тут простая чаму гэтыя кулакі не абкладзены індывідуальным падаткам. У кулака Сенькі Паштанценка ёсьць свояк сакратар гарсавету, у Сургучова Паўла, таксама стражніка, брата Тодара на кватэры жыве старшыня РВК тав. Мікалаенка, у Васіля Ананіча зяць Мельнікаў працуе ў райвыканкоме, які за невялікі час сваёй працы ў райвыканкоме пабудаваў сабе другі дом, а для Дуброўскага Анісіма ёсьць другі Дуброўскі Захар, які працуе ў фінчастцы РВК, вядомы сваімі п'янкамі і матар'яльнай сувязьзю з кулацтвам і таксама будуе вялікі дом. Старая прыказка, што „Свой сваяка бачыць здаляка" ужываецца ў нас на практыцы.

А вось партячэйка ніяк ня можа прыслухацца да голасу і досыць моцнага голасу беднаты.

Будзем спадзявацца, што мары беднякоў не прападуць дарэмна і лінія партыі рашучага наступу на кулака будзе праводзіцца ў Чарыкаўскім раёне.

Лосеў.

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ.

СТРОГА ЎЛІЧЫЦЬ ПАМЫЛКІ, КАБ ЯНЫ БОЛЬШ НЕ ПАЎТАРАЛІСЯ.

5-ЦІГАДОВЫ ПЛЯН БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН ЗА 3½ ГАДЫ.

НА РЫШТАВАНЬНЯХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАБУДОЎ.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам дырэктар Белдзяржбуду тав. Ваэрман па пытаньню аб ходзе і выніках будаўнічага сэзону адзначыў наступнае:

Апошні будаўнічы год характарызуецца пераломным у выкананьні плянаў работ. Будаўнічая праграма па лініі Белдзяржбуду прадугледжвалася ў 18 млн. рублёў, аднак, мы значна перавысілі гэту лічбу—да 20 млн. рублёў.

Па асобных акругах ход будаўнічых работ характарызуецца наступнымі данымі.

Віцебшчына. Пасьпяхова разгарнуліся будаўнічыя работы ў Віцебску. У лістападзе будзе скончана пабудова карпусоў: фабрыкі Вітшвэй, панчошна-трыкатажнай ф-кі, хлебазаводу, мясазаводу і клюбу мэталістаў. Да гэтага-ж тэрміну будзе скончан 39-ці кватэрны дом Вітшвэю: Асінаўская падстанцыя, з некаторым спазьненьнем будзе зданы кішачны завод.

Магілеў. Па Магілеву да канца будаўнічага сэзону будзе скончан масларобны завод і фабрыка шоўку.

Работы на гэтай фабрыцы некалькі затрымліваюцца з-за адсутнасьці рабочых чарцяжоў. Пры фабрыцы будуецца дом пад кватэры для рабочых.

Амаль будзе скончана пабудова дому акрвыканкому.

У бягучым годзе на будаўнічыя работы па Магілеву выдаткавана каля 3 млн. рублёў.

Барысаў. У хуткім часе будзе скончана пабудова новых фабрычных карпусоў на фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна" і асноўныя карпусы камбінату Лесбелу. Учарне будзе скончана пабудова дому выканкому, клюбу хімікаў і павільёну для хворых на сухоты.

Бабруйшчына. Згодна пляну і дагавору да канца сэзону будзе скончана пабудова камбінату, за выключэньнем жылога памяшканьня, і хлебазавод. Школа ФЗВ наўрад ці будзе своечасова пабудавана з-за недахвату цэглы.

Трэба адзначыць, што ў Бабруйшчыне будаўніцтва ідзе асабліва напружаным тэмпам з-за недастачы некаторых матар'ялаў.

Ворша. Асноўны корпус ільна-камбінату і некаторыя падсобныя прадпрыёмствы будуць поўнасьцю скончаны да канца сэзону, адпаведна пляну. Таксама будзе ўчарне зданы дом Дзяржбанку. Агульная сума будаўнічых работ па гор. Воршы складае 2 з пал. млн. рублёў.

На Асінбудзе работы ідуць асабліва шпаркім тэмпам, як у адносінах якасьці, так і ў сэнсе зьніжэньня кошту будаўніцтва. Намечаныя да пабудовы ў гэтым годзе 9 карпусоў коштам у 1.200 тыс. р. будуць зданы своечасова.

Да паловы лістапада будуць пабудаваны фасфарытныя заводы ў Крычаве і Клікавічах.

Гомельшчына. Ня гледзячы на тое, што будаўнічыя работы тут пачаліся з некаторым спазьненьнем, яны, дзякуючы захадам з боку ВСНГ і Белдзяржбуду, будуць выкананы.

Завод сельска-гаспадарчых машын, які пачаў будавацца ў мінулым годзе, сёлета будзе скончан.

Карпусы заводаў ужо пабудаваны.

БУДУЕЦЦА НОВЫ МЕНСК.

Асабліва шпарка і пасьпяхова праведзены будаўнічыя работы ў Менску.

Унівэрсытэцкі Гарадок, коштам у 4 млн. рублёў, будзе скончан нават да тэрміну—раней кастрычнікавых сьвят. Работы вядуцца у 2-3 зьмены.

Рабочыя, што працуюць на пабудове клюбу мэталістаў і харчавікоў, заключылі сацыялістычны дагавор, каб скончыць пабудову раней тэрміну—да кастрычнікавых сьвят. У працэсе работы было шмат цяжкасьцяў, недарэчнасьцяў, але яны паступова зьнішчаны.

Дом харчавікоў рог Рэвалюцыйнай і Рэспубліканскай вул. будзе зданы да канца будаўнічага сэзону. Дом пабудаван за адзін сэзон.

Дом нівэйнікаў (Мацьвееўская вул.) пабудаван таксама за адзін сэзон.

Работы па пабудове 3-га паверху над будынкам політэхнікуму вяліся у паказальным парадку і скончаны па пляну да пачатку навучальнага году.

Дом Домстроя (рог вул. К. Маркса і Камсамольскай) будзе скончан у чарне. Работа там будзе весьціся ўсю зіму з такім разьлікам, каб да лета будучага году ён быў зданы.

Сёлета закладзен фундамант сьлясарна-мэханічнага корпусу на заводзе „Энэргія". Работа будзе скончана да Кастрычкавых сьвят. К гэтаму-жа тэрміну будзе пабудавана кузьня на заводзе „Комунар".

Будаўніцтва кандытэрскай ф-кі на Ляхаўцы некалькі затрымліваецца з прычыны неасыгнаваньня дадатковых сродкаў.

Дом Ураду, коштам у 4 з палов. млн. рублёў спраэктаваны архітэктарам Ланбордам. Работы на гэтай пабудове будуць весьціся стандартным парадкам.

Сёлета мы мяркуем падвесьці фундамант з такім разьлікім, каб у жніўні наступнага году пакрыць дом дахам. У зімовы час на пабудове Дому Ураду будзе праведзена падрыхтоўка да устанаўленьня пад'ёмнікаў і мэханізмаў. Будаўніцтва карпусоў пачнецца з самай раньняй вясны. Для будаўніцтва Дому Ураду патрэбна звыш 300 вагонаў цэманту і да 12 млн. цэглы.

ЦЯЖКАСЬЦІ БУДАЎНІЦТВА.

Мінулы будаўнічы сэзон характарызуецца некаторымі цяжкасьцямі, галоўным чынам, у забесьпячэньні некаторымі будаўнічымі матар'яламі (цэгла, вапна, цэмант) і кваліфікаванай рабочай сілай.

Няхват цэглаў з пачатку сэзону быў некалькі зьменшан пасьля пабудовы Белдзяржбудам 5 новых цагельных заводаў, якія былі пабудаваны за 2-3 месяцы.

Крызіс у цэглах, які мы адчуваем к канцу сэзону, некалькі адбіваецца на ходзе работ у Бабруйску, Воршы і часткова Віцебску.

У гэтым будаўнічым годзе адчуваўся асаблівы недахват цэглаў; для сканчэньня работ не хапае 150 вагонаў. Аднак, мы часткова выкарыстоўваем цэмант прадугледжаны па пляну на сэзон 1930 г.

Не хапае паркету, а Лесбел узятыя заказы выконвае „з прахладцам"—не своячасова.

Асабліва востра ў гэтым годзе стаяла пытаньне з налічкам кваліфікаванай рабочай сілы. У самы разгар работ мы сталі перад фактам недахопу бэтоншчыкаў, арматуршчыкаў і плотнікаў. На будаўнічых работах нагляделіся некаторыя прастоі за недахопу гэтых рабочых.

Трэба прыняць рашучыя меры да падрыхтоўкі кваліфікаваных будаўнікаў, інакш ёсьць пагроза зрыву наступнага будаўнічага сэзону. Белдзяржбуд адчыніў у гэтым годзе стройзуч у Менску, і будуць адчынены яшчэ 3 такія школы.

Праз курсы ЦІП у працягу зімы будзе падрыхтавана кваліфікаваная рабочая сіла. У Менску і акругах у хуткім часе будуць адчынены курсы дзесятнікаў.

ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ, САЦ. СПАБОРНІЦТВА І БЕСПЕРАПЫННЫ РАБОЧЫ ГОД.

Падводзячы вынікі будаўнічага сэзону, трэба завастрыць увагу на якасьці прадукцыі работ. Тут мы маем цэлы шэраг выяваў. Мы маем выпадкі нясумленных адносін з боку некаторых рабочых да выкананьня работы, нядобраякасныя сталярныя вырабы (Дом Харчтрэсту, клюб мэталістаў).

На пабудове Віцебскай швэйнай ф-кі нерацыянальна і зусім бясплянава выкарыстоўваюцца матар'ялы. Вельмі часта растворавы цэмант

1929-30 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ПРАВЯДЗЕМ ПАД СЬЦЯГАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

ЯКАСЬЦЬ НАВУЧАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧАЙ СПРАВЫ--НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ.

Дзень калектывізацыі і ўраджаю нашы культурна-асьветныя ўстановы павінны зрабіць сапраўдным сьвятам рэвалюцыі ў сельскай гаспадарцы і быту. У гэты дзень асьветнік павінен паказаць—што ён зрабіў у справе сацыялістычнай перабудовы нашай вёскі.

Асьветнікі, пакажэце вашу працу!

(ДА ДНЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ І ЎРАДЖАЮ).

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі, як масавы рух,—магутная зброя ў наступе на кулака; яна вырывае самыя каронныя капіталістычнай эксплёатацыі ў вёсцы.

Дзень калектывізацыі і ўраджаю—14 кастрычніка—павінен стаць днём масавага агляду, масавай праверкі і ацэнкі ўсёй работы па ўзьняцьцю ўраджайнасьці, па калектывізацыі.

Нашы задачы ў гэты дзень. Па-першае, навочна паказаць бядняцка-серадняцкім масам посьпехі калгасаў, дасягненьні ў барацьбе за ўраджай. Па-другое, праверыць усю гэту работу, выразнасьць клясавай лініі ў ёй, ступень удзелу ў ёй мас, выявіць усе скажэньні, хібы і перашкоды. Па-трэцяе, намеціць зусім канкрэтныя меры для замацаваньня і пашырэньня дасягнутага: арганізаваць уступленьне новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы, пашырэньне і ўзбуйненьне існуючых калгасаў, масавыя аграмерапрыемствы і г. д.

Барацьба за ўраджай і калектывізацыю—адно з важнейшых зьвеньняў пяцігодкі.

Шырокія бядняцка-серадняцкія масы павінны ня толькі ведаць пяцігодку ва ўсім яе абхвале, агульны ход яе выкананьня, але трэба мабілізаваць актыўнасьць мас вакол выкананьня пяцігодкі. Пагэтаму неабходна шырока растлумачыць мясцовыя задачы ў пляне пяцігодкі, разам з масамі праверыць, як ідзе ў іх райёне і сельсавеце выкананьне плянаў па пашырэньню засеўнай плошчы, па правядзеньню аграмінімуму, па калектывізацыі.

Дзень калектывізацыі і ўраджаю, гэта—масавае сьвята. Так і трэба яго правесьці. Мясцовыя арганізацыі—партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія, культурныя ўстановы і асьветнікі павінны папрацаваць над тым, каб надаць яму характар менавіта масавага, жывога, яскравага і паказальнага сьвята, якое шырока скалыхне і зацікавіць вёску.

Асноўны рычаг для шырокай мабілізацыі мас вакол лёзунгаў гэтага дню—сацыялістычнае спаборніцтва. Трэба паставіць задачу—у гэты дзень больш шырока ўцягнуць вёску ў сацыялістычнае спаборніцтва, якое да гэтага часу яшчэ там не разгорнута як сьлед. Калгасы і савгасы павінны даць справаздачу аб першых выніках па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Сьвята павінна мець выразны клясавы характар: барацьба за ўраджай і калектывізацыю, як шлях наступу на кулака, пяцігадовы плян індустрыялізацыі краіны і калектывізацыя сельскай гаспадаркі, як шлях сацыялістычнай рэканструкцыі нашай гаспадаркі і поўнага выцясьненьня з яе капіталістычных элемэнтаў,—усё гэта павінна быць паказана і завострана ў дакладах, справаздачах, на с.-г. выстаўках.

Наогул цэлы шэраг масавых пачынаньняў—ворыва гэктару калектывізацыі, утварэньне дагавораў на кантрактацыю, каапэраваньне беднаты, дапамога беднякам у абмалоце хлеба і іншых работах, закладка ў калгасах і па вёсках новых культурна-бытавых устаноў, рамонт школ, шляхоў і г. д.—усё гэта павінна адзначыць сьвята ўраджаю і калектывізацыі.

Справа асьветнікаў—узьняць і арганізаваць ініцыятыву ў гэтым кірунку і самім стаць застрэльшчыкамі і актыўнымі ўдзельнікамі ва ўсёй масавай рабоце.

Асьветнікі, школы, хаты-чытальні ня толькі павінны агітаваць за калгасы, за ўзьняцьце ўраджайнасьці: яны павінны даць справаздачу ў гэты дзень перад сялянскімі масамі, паказаць на выстаўках, у сваіх дагаворах па сацыялістычнаму спаборніцтву што канкрэтна яны робяць для калектывізацыі і ўзьняцьця ўраджаю.

Асабліва павінны яны ў гэты дзень завастрыць увагу бядняцка-серадняцкіх мас і мясцовых арганізацый на неабходнасьці ўзьняць культурна-бытавую работу ў калгасах і вакол іх. Гэты вучастак работы—самы адсталы. У дзень калектывізацыі неабходна практычна распачаць арганізацыю ў калгасах школ для дзяцей і дарослых, клюбаў, гурткоў, дзіцячых ясляў, сталовак і інш.

Ня трэба забываць таксама і пра тое, што 14 кастрычніка супадае з адным з рэлігійных сьвят—„пакроў". Вытворчае, культурнае сьвята павінна быць яскрава супроцьпастаўлена вясковым фэстам з дзікім п'янствам і разгулам.

Асьветнікі разам з камсамолам, піянэрамі і сялянскім актывам павінны паклапаціцца аб тым, каб у сьвяце ня было казёншчыны, нуды, шаблёну, каб гэта было сапраўднае сьвята рэвалюцыі ў сялянскай гаспадарцы і быце.

ТРЭБА ШУКАЦЬ КАНКРЭТНЫХ ВІНОЎНІКАЎ АДСЕВУ БАТРАЦТВА І БЕДНАТЫ СА ШКОЛЫ.

Кожны год мы камплектуем нашы 7-годкі па прынцыпу клясавага адбору.

Мы аддаем батраку і бедняку першае месца ня толькі ў клясе і інтэрнаце, але забясьпечваем яго і матар'яльна, бо гэты праслоек у нашых навучальных установах самы каштоўны сярод усяе астатняе вучнёўскае масы. Але часта на справе выходзіць, што мы толькі многа гаворым, многа пішам прыгожых рэзалюцый аб гэтай дапамозе, а рэальна дапамагаем вельмі і вельмі мала. Яшчэ горш, што мы, маючы нават сродкі, ня толькі несваечасова іх рэалізуем на батрацтва і беднату, але часам эканомім на гэтых сродках, або пры наяўнасьці вялікай колькасьці батракоў і беднякоў ухітраемся гэтыя сродкі ня страціць па прызначэньню ў бягучы бюджэтны год.

Ёсьць цэлы шэраг фактаў, калі з прычыны несваечасовай выдачы сродкаў, слабага разгарненьня грамадзкай думкі навокал гэтага пытаньня, са школ 7-годак адсявалася амаль уся беднота, залічаная ў 5-ю групу. Так, напр., **у Полацкай райённай 7-годцы, з прычыны несваечасовай выдачы грошы на беднату ў 29-30 навучальным годзе, ужо выбылі два самых бяднейшых вучні—Зуеў і Глусцоў.** Тыя, што яшчэ трымаюцца ў школе, жывуць упрогаладзь і магчыма, што пакінуць школу ў хуткім часе. Ня гледзячы на тое, што другі месяц ужо цягнуцца заняткі, што дзеля прыёму батракоў і беднаты тры разы засядала камісія, якая чысьціла больш заможных вучняў з мэтай прадастаўленьня месц беднаце,—піводнага разу ніхто з райёну не пацікавіўся аб тым, як жыве і ў якіх уновах знаходзіцца гэта бядната.

Ёсьць такія райёны, якія ўхітраюцца не скарыстаць фонду беднаты, хоць гэта бедната ходзіць у школу босай і галоднай. **У мінулым годзе па Асьвейскаму райёну (Полаччына) не расходавана 113 руб., па Ветрынскаму 17 р., а ў Полацкім райёне мясцовы каапэратыў і на сёньнешні дзень шые боцікі і вопратку.**

У цэлым шэрагу райёнаў гэтыя сродкі выдаваліся тады, як скончыліся заняткі. Такія адносіны да батрацтва і беднаты ў школе зьяўляюцца ня толькі нядбайнымі, але праступнымі, за што вінаватых трэба прыцягваць да адказнасьці.

Аб гэтым мы павінны біць трывогу зараз-жа, пакуль яшчэ ня позна. Ніякіх 48 проц. адсеву і 17 проц. другагодніцтва сярод батрацкіх і бядняцкіх дзяцей у школе! Мы павінны імкнуцца да таго, каб батрацтва і беднота і пры наведваньні і пры пераводах была на ўсе 100 проц. у школе.

Шырэй грамадзкую думку навокал гэтага пытаньня, больш увагі да гэтай справы з боку РВК!

Толькі пры самых уважлівых адносінах да гэтага пытаньня з боку належных устаноў пры належным разгарненьні шырокай грамадзкай думкі на мейсцы мы зможам скласьці неабходныя ўмовы для навучаньня нашае беднаты і батрацтва ў 7-годках, падрыхтаваць іх у жыцьцё сьвядомымі і незамянімымі працаўнікамі па ўсіх галінах нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

П. Б.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА КУЛЬТУРНЫМ ФРОНЦЕ.

СУХІЯ ПУНКТЫ УМОЎ ПЕРАТВОРЫМ У ЖЫВУЮ СПРАВУ.

ВУЧНІ-СПАБОРНІКІ.

(Юравіцкая 7-на, Мазырчына).

Вучні II канцэнтру Юравіцкай сямігодкі на агульным сходзе паранашлі правесьці спаборніцтва групы з групамі (VII-а з VII-б; VI з V). Умовы спаборніцтва ахапляюць паўныя бакі жыцьця груп.

З дню ўвядзеньня ўмовы спаборніцтва будзе камісіяй улічвацца у якой з груп лепшае наведваньне школы, дзе менш спазьненьняў, дзе лепшая таварыская дысцыпліна, якая з груп лепш праводзіць грамадзка-карысную працу, якая з груп больш выпісвае газэт, часопісяй і лепш іх скарыстоўвае, дзе лепшыя, больш таварыскія адносіны паміж вучнямі розных нацыянальнасьцяў і г. д. У канцы камісія ўсё падлічыць і дасьць пэўны вынік спаборніцтва па школе.

Моладзь імкнецца ўвязваць і ўвязвае вучобу з грамадзкім жыцьцём.

Гэта дапаможа вучням па выхадзе са школы стаць у шэрагі актыўных, сьвядомых будаўнікоў сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Лукашэвіч.

ЗЬНІШЧЫМ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ

(Буда-Кашалёўскі р., Гомельшчына).

70 членаў настаўніцкага калектыву Буда-Кашалёўскага райёну на сваёй канфэрэнцыі, у парадку сацыялістычнага спаборніцтва, падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на паўтарамесячны заработак і далі абяцаньне распаўсюдзіць пазыку сярод насельніцтва на 75 руб. кожны. Апрача гэтага, у парадку сацыяліст. спаборніцтва настаўніцтва адмовілася ад платы за працу на лікпунктах, а на гэтыя сродкі парашыла адчыніць 4 дадатковых камплекты ў школах сацвыху.

Сёлета будзе адчынена і дарма абслужана 44 лікпункты, 9 школ малапісьменных і 2 камбінаваныя школы. Сіламі платных ліквідатараў будзе абслужана 3 лікпункты.

У 14-ці населішчах настаўніцтва абяцае ліквідаваць няпісьменнасьць на ўсе 100 проц.

На сацыялістычнае спаборніцтва як на падпісцы на 3-ю пазыку, так і ў працы па ліквідацыі няпісьменнасьці, настаўніцкі калектыў тэлеграфна выклікаў настаўнікаў Чачэрскага, Уваравіцкага і Рэчыцкага райёнаў.

Селькор-наст. Міх. Блісьцінаў.

НЕ СПАБОРНІЦТВА, А ПУСТАЯ ШУМІХА.

Сацыялістычнае спаборніцтва разьвінулася па ўсіх галінах нашага будаўніцтва, яно захапіла рабочых усіх фабрык і заводаў. Але амаль што зусім не адчуваецца спаборніцтва сярод працаўнікоў асьветы ў культасьветных установах. Яскрава аб гэтым кажуць вынікі праведзенага абгляду з боку ЦП белпрацасьветы ў Аршанскай акрузе, а таксама матар'ялы, сабраныя па райёнах Бабруйшчыны.

Аснаўныя прычыны такой сьпячкі наступныя: фармальныя адносіны з боку саюзных органаў, якія абмежаваліся толькі пастаноўкаю пытаньня на сваіх паседжаньнях або агульных сходах (апошнім пытаньнем); прынятыя пастановы, або падпісаныя дагаворы падмываліся да справы, а асьветніцкая маса не азнаёмлена з імі; пры прыняцьці пастаноў абмяжоўваліся выкліканьнем пабольш іншых райёнаў (рабілі шуміху), а што трэба рабіць практычна на месцы, каб выканаць пастанову, ці дагавор, пра гэта забываліся.

Інспэктура нарасьветы ніякага ўдзелу не прыняла ў справе дапамогі ў сацыялістычным спаборніцтве. Былы бабруйскі акруговы інспэктар Таўкачоў, напрыклад, заявіў: „Справаю сацыялістычнага спаборніцтва інспэктура займацца ня можа, бо гэта будзе адміністрацыйны нажым".

Зараз, калі пачаўся новы навучальны год, неабходна, каб справа сацыялістычнага спаборніцтва знайшла адбітак у працы ўсіх саюзных органаў, інспэктуры і ахапіла працаўнікоў усіх культасьветных устаноў.

Дзеля таго, каб кожны працаўнік практычна прымаў удзел у сацыялістычным спаборніцтве, трэба пазнаёміць кожнага прафдэлегата з дагаворам і наладзіць спаборніцтва паміж асобнымі прафкалектывамі, асобнымі ўстановамі ў межах райёну, сельсавету, уцягнуўшы ў гэту справу і інспэктуру.

Крытыка і самакрытыка работы па сацыялістычнаму спаборніцтву ўсіх органаў павінны ахапіць шырокія асьветніцкія масы і мець адпаведны ўплыў на разгарненьне работы.

І. В.

СПАБОРНІЦТВА НА ПРАКТЫЧНЫЯ РЭЙКІ.

Асьветнікі Самахвалавіцкага райёну на сваей райённай канфэрэнцыі пастанавілі выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва асьветнікаў Вузьдзенскага і Сьмілавіцкага райёнаў. Галоўныя пункты спаборніцтва наступныя:

Зьнізіць другагодніцтва ва ўсіх школах райёну да 7 проц., дзеля чаго палепшыць якасьць акадэмічнай дапамогі адстаючым вучням. Процант адсеву вучняў на працягу навучальнага году зьнізіць да 3, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на затрыманьне ў школе батракоў і дзяцей беднаты. Узмацніць працу камітэту па дапамозе бяднейшым вучням у школе, давёўшы фонд дапамогі ў сямігодцы да 500 руб., апрача сродкаў, прадугледжаных па каштарысу, а ў вясковых школах—да 2.780 руб. Узмацніць працу органаў вучнёўскага самакіраваньня і грамадзкіх арганізацый, якія існуюць у школах, завастрыўшы асаблівую ўвагу на піянэр-працу, прымацаваўшы для гэтага настаўнікаў да піянэр-атраду—аб сваей працы ў гэтым кірунку яны павінны рабіць пэрыядычныя справаздачы на пасяджэньнях школьных радаў. Дабіцца 100 проц. наведваньня школ дзяцьмі ў дні рэлігійных сьвят. Склікаць 6 бацькаўскіх сходаў у сямігодцы: 3 сходы з бацькамі вучняў 2-га канцэнтру і 3 сходы з бацькамі вучняў 1-га канцэнтру, а таксама па 3 сходы ў кожнай вясковай школе. Палепшыць зьмест насьценных газэт, шырока разгарнуўшы крытыку і самакрытыку ў сьценах школ; прыняць удзел у выпуску насьценных газэт пры хатах-чытальнях, сельсаветах і чырвоных куткох, а таксама арганізаваць выпуск насьценгазэт у тых школах, дзе іх ня было ў мінулым годзе. Правесьці падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод вучняў сямігодкі на 50 руб., а ў кожнай вясковай школе—ня менш, як на 5 руб. Прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні ўсіх гаспадарчых і палітычных кампаній, згуртоўваючы навакол школы батрацка-бядняцкі актыў і ўцягваючы ў практычную працу па гэтай справе вучняў старэйшых клясаў. У парадку грамадзкай працы арганізаваць і абслужыць сіламі сямігодкі 4 лікпункты, на якіх павінна навучацца ня менш 60 чалавек, а за каштарысным сродкі абслужыць 5 лікпунктаў з лікам вучняў 75; па райёну арганізаваць 71 лікпункт, на якіх павінны навучацца ня менш 1.195 чал. Сіламі сямігодкі зрабіць пасадку дэкаратыўных дрэў на гасьцінцу Менск-Слуцак у колькасьці 1000 экзэмпляраў; пры кожнай вясковай школе зрабіць дрэванасаджэньне, а таксама і пасадку па гасьцінцах, калі школа знаходзіцца ня больш як за 3 кілёмэтры ад гасьцінцу; кожная школа павінна пасадзіць ня менш 100 дрэўцаў. Дзеля набыцьця практычных ведаў вучнямі і пашырэньня сярод насельніцтва садоўніцтва, пры 7-мігодцы залажыць гадавальнік пладовых дрэў на 100 экзэмпляраў.

П. Лабус.

Даб'ёмся арганізацыі 3-х калгасаў.

(Азарыцкі райён, Мазыршчына).

Канфэрэнцыя асьветнікаў Азарыцкага райёну (Мазыршчына) аднагалосна выказалася за ўступленьне ў сацыялістычнае спаборніцтва з асьветнікамі Капаткевіцкага райёну. Прынят праэкт дагавору спаборніцтва і камандыраваны прадстаўнікі ў Капаткевічы для падпісаньня дагавору.

Галоўнымі пунктамі дагавору зьяўляюцца: павялічэньне навучальнага году да 200 дзён, максымальнае ахапленьне школаю дзяцей беднаты, батрацтва і калгасьнікаў, зьмяншэньне другагодніцтва, уцягненьне грамадзкасьці ў школьнае жыцьцё, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод 300 чал. (беднаты і батрацтва), распаўсюджаньне 3-й пазыкі індустрыялізацыі, **ажыцьцявіць увядзеньне аграмінімуму ў 5 паселішчах, арганізаваць 3 калгасы і 11 с.-г. таварыстваў.**

Таксама прыняць дагавор сувязі з піянэрамі па пытаньнях дапамогі піянэрам у іх працы.

Асьветнікі ў адказ на наскокі кітайскіх белабандытаў уносяць 1 процант зарплаты на працягу 3-х месяцаў на самалёт „Асьветнік".

Прынята пастанова аб 100-процантнай выпісцы газэты „Савецкая Беларусь" асьветнікамі і распаўсюджаньні 1 газэты на 5 сялянскіх двароў.

Т. Кулакоў.

„Савецкую Беларусь"— у асьветніцкія масы.

Кожная школа будзе мець „Савецкую Беларусь"

(Вушацкі райён, Полаччына).

Асьветніцкая канфэрэнцыя Вушацкага райёну пастанавіла выпісаць для ўсіх школ райёну па аднаму экзэмпляру газ. „Савецкая Беларусь" на 1 год.

Выкананьне гэтай пастановы даручана МК.

Райінспэктар выпісвае за рахунак культасьветных сродкаў для ўсіх школ газ. „Чырвоная Полаччына" і часопісь „Асьвета".

ТУРКАЎ.

Выпісваем „Савецкую Беларусь" калектыўна.

(Вузьдзенскі райён, Менскай акругі).

Яшчэ вясною гэтага году на адным з райённых канфэрэнцый асьветнікі Вузьдзенскага райёну пастанавілі выпісаць калектыўна газэту „Савецкая Беларусь". Падпісаліся на газэту ўсе асьветнікі.

На райённай канфэрэнцыі, якая нядаўна адбылася, асьветнікі райёну пастанавілі і далей працягваць калектыўную падпісну на газэту. Апрача гэтага яны ўзялі на сябе абавязак пашыраць падпіску на „Савецкую Беларусь" і сярод шырокіх мас працоўнага насельніцтва райёну.

СЕЛЬКОР.

Навіны ў пэнсіённым забясьпечаньні асьветнікаў.

Паводле пастановы ЦВК і СНК Саюзу, Народны Камісарыят Працы СССР распрацаваў інструкцыю аб пэнсіённым забясьпечаньні працаўнікоў асьветы за выслугу гадоў.

Правам на пэнсію карыстаюцца настаўнікі школ I ступені і I канцэнтру сямігодак, працаўнікі хат-чытален, бібліятэкары гарадзкіх і вясковых бібліятэк, настаўнікі сельска-гаспадарчых школ у сельскіх мясцовасьцях, пэдагагічны пэрсанал дзіцячых дамоў, настаўнікі другога канцэнтру школ сацвыху, фабрычна-заводзкіх 9-ці годак, школ сялянскай моладзі, выкладчыкі тэхнікумаў, прафшкол і вучэбна-вытворчых майстэрняў, а таксама інструктары вытворчых працэсаў гэтых навучальных устаноў, пэдагагічны пэрсанал дашкольных устаноў, настаўнікі лікпунктаў і райённыя інспэктары нарасьветы.

Пэралічаныя катэгорыі працаўнікоў асьветы набываюць права на пэнсію пасьля 25 гадоў працы ў паказаных установах, у тым ліку 5 гадоў пры Савецкай уладзе.

Пэнсія ўстанаўліваецца ў наступных разьмерах: 40 руб. у месяц настаўнікам старшых канцэнтраў школ сацвыху, прафтэхнічных школ і райінспэктарам нарасьветы; 50 руб. у месяц пэдагагічнаму пэрсаналу тэхнікумаў, 30 руб. усім іншым катэгорыям асьветнікаў.

Зараз Наркамасьветы БССР узгадняе гэту інструкцыю з саюзам працаўнікоў асьветы.

Завочніка трэба навучыць самастойна працаваць.

(Да канфэрэнцыі студэнтаў Завочнага Рабфаку).

Завочны Рабфак вядзе свае заняткі па праграме дённага Рабфаку і налічвае зараз да 400 чалавек студэнтаў-завочнікаў. З іх калі 100 чал. партыйцаў і звыш 100 ч.—члены ЛКСМ. Каля паловы ўсіх рабфакаўцаў—рабочыя з вытворчасьці і савгасаў, а астатнія — сяляне-актывісты, распыленыя па вёсках Беларусі. На жаль, з гэтай часткі студэнцтва рэгулярна прадстаўляе сваю працу вельмі малы процант, што складае пагрозу значнаму адсеву. Трэба знайсьці такія спосабы, каб не дапусьціць гэтага адсеву:

Што робіць астатняя частка студэнцтва на вёсцы і на фабрыцы — гэта невядома Рабфаку, ад іх таксама няма ніякіх вестак.

Гэтаму, як відаць, ёсьць пэўныя прычыны, прычым асноўная з іх — непадрыхтаванасьць да самастойнай прапрацоўкі заданьняў; гэта можна бачыць з работ студэнтаў, якія прысылаюцца ў Рабфак.

У значнай частцы студэнцтва ёсьць няўпэўненасьць у свае сілы.

У некаторай частцы студэнцтва, больш адукаванай, ёсьць думка, што яны могуць не пасылаць сваіх работ, або і зусім не прапрацоўваць заданьняў, а толькі чакаць пераводных іспытаў на другі курс. Гэта, разумеецца памылка, бо кожнае прапрацаванае заданьне павінна студэнту залічвацца, непрадстаўленьне-ж работы па аднаму заданьню выклікае мэханічнае выключэньне з Рабфаку.

У нязначнай частцы студэнцтва назіраліся нядбайныя адносіны да прапрацоўкі заданьняў, сьпісваньне работ таварышоў, павярхоўныя адказы на пытаньні і інш. Кожнаму студэнту трэба памятаць, што ў часе іспытаў з яго будуць патрабаваць веды па ўсяму курсу рабфаку.

Ёсьць частка і такіх таварышоў, у якіх не хапае належнай вытрымаласьці; зьявілася жаданьне вучыцца, зроблены першыя крокі, але крыху неўдалася першая работа і жаданьне вучыцца астыла. Такім таварышам патрэбна дапамога, іх трэба падштурхнуць, каб раз узьнікшае жаданьне не астывала.

Побач з гэтым мы бачым работы і вельмі здольных таварышоў, якія зусім зразумелі заданьні.

Хутка канчаецца тэрмін прадстаўленьня работ на другому заданьню, а работа ад студэнтаў усё-ж паступае слаба. Трэба знайсьці такія мэтады, якія прыцягвалі-б да занятку, да самастойнай працы завочніка - рабфакаўца.

Як мэтад ажыўленьня работ студэнтаў, высоўваецца канфэрэнцыя слухачоў Завочнага Рабфаку, якая павінна адбыцца ў кастрычніку г. г.

На канфэрэнцыі слухачы Рабфаку змогуць практычна азнаёміцца, як трэба прапрацоўваць матар'ял, навучыцца карыстацца падручнікам і заданьнем, высьветліць хворыя моманты арганізацыйнага характару і недахопы заданьняў.

З другога боку, карысна для студэнтаў азнаёміцца з навучальнай установай, у якую яны ўступілі, каб яны даведаліся, у якіх умовах жывуць і вучацца іхныя таварышы, што прышлі з вытворчасьці або з вёскі. Вельмі карысна паказаць студэнтам пэрспэктывы іх работы, паказаць Менск і яго культурныя ўстановы, яго фабрыкі і заводы, паказаць сапраўднае будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі, каб гэтым яшчэ больш узьняць і падтрымаць жаданьне стухачоў вучыцца.

Ня менш карысна і кіраўнікам рабфаку азнаёміцца з кім яны маюць справу. Праўда, на гэта патрэбны пэўныя сродкі з боку Наркамасьветы, але гэтыя выдаткі, бязумоўна, сябе апраўдаюць.

Трэба даць зарадку слухачам на 1929-30 навучальны год і падцягнуць акадэмічна адсталых таварышоў. Толькі пры такіх умовах магчыма чакаць ад завочнага навучаньня пажаданых для нас выпікаў.

С. Якаўлеў.

НЕЗАКОНЧАНАЕ АЗДАРАЎЛЕНЬНЕ.

Пазбавіўшыся варожага элемэнту сярод студэнцтва і пэдагагічнага складу, Полацкая Профтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва ўсё-ж ня можа нармальна працаваць, бо ня мае памяшканьня.

Чыноўніцкія адносіны полацкіх кіраўнікоў зрываюць падрыхтоўку кадраў чырвоных будаўнікоў.

У 1928 годзе Народны Камісарыят Асьветы БССР вызначыў для першае на Беларусі прафтэхшколы агнятрывалага будаўніцтва каля 10.000 рублёў. Пралежалі гэтыя грошы некалькі месяцаў бяз жаднага руху, урэшце ў студзені месяцы бягучага году Полацкі акрінспэктарыят нарасьветы атрымаў паперку з НКА БССР, у якой катэгарычна сказана: „Адчыніць прафтэхшколу агнятрывалага будаўніцтва. Набор сорак чалавек".

Куды-ж яе зьмясьціць?—думалі кіраўнікі асьветнага фронту.

І сапраўды, у горадзе няма дзе прасунуць пальца, непамерны жыльлёвы крызіс.

Хтосьці ўспомніў пра памяшканьне былой ватнай фабрыкі—дармо, што памяшканьне гэта ня было прыстасавана да вучобы, цеснае, душнае, не адрамантаванае. Так і рашылі: прафтэхшколу агнятрывалага будаўніцтва зьмясьціць на Запалоцьні (акраіна гораду) у памяшканьні былой фабрыкі. Зараз-жа прызначылі загадчыка школы Васіля Міронава, якому і даручылі „давесьці справу да канца"...

БУКЕТ АНТЫСЭМІТАЎ, КУЛАКОЎ, НЭПМАНАЎ І СПУКУЛЯНТАЎ.

Пачалі ўкамплектоўваць толькі што адчыненую школу. З падлядзеных у школу 44-х заяў было прынята 40 асоб.

Хто-ж яны, гэтыя прынятыя студэнты?

Гэта людзі, на палову ня прынятыя ў іншыя навучальныя ўстановы. Большасьць з іх далёка ад нас, як неба ад зямлі. Карацей кажучы, у прафтэхшколу прайшла галерэя нашых клясавых ворагаў—кулакоў, антысэмітаў, нэпманаў, спэкулянтаў і ліпэнцаў. Школа для іх парасон, пад якім можна схавацца ад дажджу і пралезьці ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Студэнты Шэр, Губскі, Хрулёў арганізуюцца ў гняздо антысэмытаў. Яны знаходзяць задаволеньне ў траўлі Айзіка Тумянскага. Для іх Айзік—ня студэнт, а „пархаты", „жыдоўская морда". Яго можна біць ботам, Айзіка можна выцяць высьпіткам, на яго дазваляецца плёваць і лаяцца, бо ён сын беднага яўрэя.

Далей ідуць Плісквы, Сігавы, Громавы, Гурчонкі, Ніны, Марылі, дзеці мамонек, папенек. Беспартыйны студэнт Лісоўскі становіцца... адказным сэкратаром камсамольскай ячэйкі і пачынае арудаваць, кіраваць жыцьцём студэнтаў.

МІРОНАЎ І СЬПЯВАКА ЗАЦІСКАЮЦЬ РОТ СТУДЭНТАМ.

Самыя выдатныя фігуры ў школе—Міронаў і Сьпявака. Яны разам думалі, разам хадзілі, рабілі і разам... пілі. Адным словам, адзін за аднаго, а другі за другога...

Сьпявака быў прызначэн у школу выкладчыкам спэцыяльных дысцыплін. Ён па прафэсіі—інжынэр. Лекцыі зрываюцца па віне выкладчыка, які кожны дзень пазьніцца на 2-3 гадзіны. Абураныя студэнты адказваюць на гэта „забастоўкай". Загадчык школы Міронаў на гэта не зьвяртае ўвагі. Нагрузка выкладчыкаў, сыстэма, плянавасьць, праграма ў школе адсутнічаюць.

На абсталяваньне і рамонт школы адпускаецца 3000 руб. Міронаў і Сьпявака скарыстоўваюць сродкі на свайму погляду. Робяць нікому непатрэбныя перагародкі, кідаюць сотні рублёў на нікудышняе абсталяваньне майстэрняў, на рамонт дзьвярэй, завязваюць сувязь з варожымі элемэнтамі, складаюць дутыя акты, а тым часам сыстэматычна наладжваюцца сямейныя вечары, папойкі.

Усе гэтыя злачынствы праходзілі на вачох студэнтаў, частка з якіх хварэла за школу, за вучобу і працу.

На адным з агульных сходаў студэнты бэтоннае майстэрні Яблонскі і Дамарацкі досыць хлёстка выступілі супроць агідных прадзелак загадчыка школы Міронава, выкладчыка-інжынэра Сьпявакі, майстроў Шэмпеля, Балбатунова, Шчыдрава і кампаніі.

У адказ на здаровую крытыку Яблонскі і Дамарацкі дыпляёматычна выкідваюцца з майстэрні „за бузу". Студэнтаў Байко і Быхаўца, якія падтрымлівалі здаровую крытыку, Сьпявака выклікае ў канцэлярыю, з пагрозай стукае па сталу і кажа:

— Критикуйте взирая на лица. Если вы еще посмеете, то я... вашу мать... (Ён-жа загадваў усім студэнтам ня пісаць на беларуску).

Варта было студэнту Трэйваеў выступіць адзін раз і сказаць, што „ў нас зажым самакрытыкі", як для яго Сьпявака прысьвячае цэлы шэраг лекцый, зьбіраючы кампрамэтуючы матар'ял. Студэнт, сын беднага селяніна, Знарка Ўладзімер, быў выключан са школы пад матывіроўкай „няздольны", а на самай справе гэта патрэбна было выкладчыку Сьпяваку, пад дудку якога скача загадчык школы Міронаў.

З болем у сэрцы замоўклі хлапцы, а пра дзяўчат няма чаго і казаць. Студэнты бачуць, што: дарэмна заганяюцца грошы на шалёвашны вадаправод, папаўняюцца начальніцкія кішэні за збыт студэнцкіх вырабаў, растуць залатыя зубы ў кухаркі Крупко, якая заўладала сэрцам Міронава, чуюць пра камандыроўкі і разьезды Міронава ў Віцебск, Старае Сяло, у Менск. Усё бачуць, усё чуюць, а сказаць ня могуць, бо крытыкаваць забаронена. Тымчасам студэнты чатыры месяцы вучыліся на сухім хлебе з вадой.

ПАЧАЛОСЯ АЗДАРАЎЛЕНЬНЕ, АЛЕ НЯ ПОЎНАЕ.

Урэшце, наступіў канец усім бясчынствам, якія мелі месца ў прафтэхшколе агнятрывалага будаўніцтва. Вясной г.г. школу ачысьцілі ад варожых элемэнтаў, ад антысэмітаў. З 40 асоб, прынятых у школу, засталося ўсяго 25.

Пры акругхоме камсамолу была створана спэцыяльная камісія, якая ўсебакова высьветліла становішча школы, злачынныя паводзіны Міронава, Сьпявака і інш. Даклад камісіі стаяў на бюро акругкому. Бюро было папярэджанае, нават з удзелам студэнтаў прафтэхшколы.

Камісія выказалася, каб загадчыка школы зусім зьняць з працы (ён камсамолец), бюро ячэйкі КСМ пры школе было распушчана, шэраг камсамольцаў атрымалі вымовы, некаторых выключылі. Разам з тым камісія адзначыла неабходнасьць правесьці вялікую растлумачальную працу сярод студэнтаў, каб у гэты навучальны год забясьпечыць у школе рабочае ядро.

На вялікі жаль, гэта пастанова ня ўся праведзена ў жыцьцё. Растлумачальная праца сярод рабочай моладзі адсутнічала. Загадчык школы Міронаў працаваў пастараму, разьяжджаючы ўсё лета на Старасельскую Дачу да сваіх знаёмых, да дзяўчат. Падрыхтоўкі да новага навучальнага году не вялося.

У выніку на 1 верасьня г.г. на 40 месц у школу было пададзена ўсяго 38 заяў, у ліку якіх ня было піводнай заявы ад рабочых, батракоў і калгасьнікаў.

НОВЫ ЭТАП.

Сёньня для школы наступіў сапраўды новы этап. Выкладчыка спэцыяльных дысцыплін—інжынэра Сьпявакі песенька сьпета, і яго ўжо няма ў школе. Прызначан новы загадчык, Міронаў чамусьці застаўся на працы ў якасьці інструктара.

Тыдзень работы, тыдзень бегатні, тыдзень падрыхтоўкі, пасьля чаго адбылося ўкамплектаваньне школы. У ліку 40 асоб прынятых на першы курс: 11 рабочых, 2 батракі, 2 калгасьнікі, 7 сялян, вызваленых ад падатку, 4 плацячых падатак да 5 руб., 6 плац. падатак да 10 руб., 3 плац. падатак ад 10 да 11 руб., 2 саматужнікі без патэнту, 3 дзяцей служачых і спэцыялістых.

Зараз школа налічвае 70 студэнтаў, сярод якіх вялікая колькасьць камсамольцаў. Сацыяльны склад добры, адпавядаючы нашым запатрабаваньням. Здаецца усё добра, прыемна, трэба пачынаць заняткі. Але школа ня мае інтэрнату, ня мае памяшканьня і галоўных прылад для вучобы. Пачынаецца „хожденне по мукам".

„НЯ БУДЗЬЦЕ ПАТРЫЁТАМІ".

Тут сустракаюцца фармалізм з бюракратызмам, з бяздушнымі чыноўнікамі. На просьбу загадчыка пацясьніць адну з гарадзкіх школ, вымеркаваўшы гэтым самым памяшканьне для прафтэхшколы, гарадзкі інспэктар нарасьветы Налашчанка нэрвова адказвае:

— Ня будзьце патрыётамі. А між іншым зьвяртайцеся да свайго прамога начальства—у Наркамасьветы Беларусі, хай там галавастыя людзі думаюць.

Гарадзкі савет таксама без фармалізму не абыходзіцца. Прапануюць падаць „дакладную пісьмовую". Пакуль што невядома, што выйдзе з пададзенай пісьулькі.

Акрінспэктар Нарасьветы падыходзіць да гэтага пытаньня з прахладцам, спакойна, так як і да III школы сямігодкі, якая рамантуецца другі год.

— Чаго крычаць? Далі для заняткаў памяшканьне ў польшколе з 2 да 6 гадзіны і лад на.

Хтосьці ўнёс прапанову паціснуць пад інтэрнат школы краязнаўчы музэй.

Ня менш пасыўна адносіцца да школы і НКА БССР, у асобе інспэктара прафтэхшколы тав. Сіліна, які ніколі нават у пісьмовай форме не пацікавіўся сапраўдным становішчам школы, адкуль павінны выйсьці сотні чырвоных спэцыялістых.

Паўстае пытаньне: жыць або памерці Полацкай прафтэхшколе. Больш уся

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра захады для ўзмацненьня калгаснай сыстэмы.

На падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 21 чэрвеня 1929 г. „Пра захады для ўзмацненьня калгаснай сыстэмы" Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Даць Белкалгассаюзу, акруговым калгассаюзам, куставым аб'яднаньням калгасаў права апэрацыйна-гаспадарчай дзейнасьці, прызнаўшы куставыя аб'яднаньні калгасаў юрыдычнымі асобамі.

2. Прапанаваць Белкалгассаюзу не пазьней як праз два тыдні падаць у Эканамічную Нараду праэкты патрэбных вымен у статуты Белкалгассаюзу і акруговых калгассаюзаў і праэкт статуту куставых аб'яднаньняў калгасаў, прадугледзеўшы ў гэтых статутах парадак утварэньня асноўных і іншых капіталаў.

3. Лічыць патрэбным сканцэнтраваць абслугоўваньне і фінансаваньне вялікіх калгасаў з пасеўнаю і сенакоснаю плошчаю ад 1000 га, куставых аб'яднаньняў калгасаў з пасеўнаю плошчаю ў 1500 га і спэцыяльных калгасаў (жывёлагадоўча-малочных ад 500 шт. жывёлы, садова-гародных ад 100 га саду альбо 150 га гароду) у Белкалгассаюзе.

Абавязаць Белкалгассаюз падаваць гадавыя вытворча-фінансавыя пляны і пляны будаўніцтва паказаных калгасаў на зацьверджаньне СНК не пазьней 1-га мая папярэдняга году.

4. Для падрыхтоўкі спэцыяльных кадраў кваліфікаваных аграномаў і тэхнікаў для калгасаў, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы ў 1929-30 навучальным годзе адчыніць факультэт арганізацыі буйнага земляробства і калгаснага будаўніцтва пры Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі і арганізаваць тэхнікум калектыўнага земляробства.

5. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з Белкалгассаюзам не пазьней 15-га верасьня г. г. распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для ўзмацненьня культурнай працы ў калгасах, з тым, каб яны ажыцьцяўляліся, пачынаючы з 1929-30 г., і падаць на зацьверджаньне СНК БССР.

6. Даць Белкалгассаюзу права падаваць законапраэкты беспасрэдна ў заканадаўчыя органы БССР.

Час. вык. абав. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.

28 верасьня 1929 г.

г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Нар. Комиссаров БССР

о мероприятиях по укреплению колхозной системы.

На основании постановления ЦИК и СНК СССР от 21 июня 1929 г. „О мероприятиях по укреплению колхозной системы, Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Предоставить Белколхозсоюзу, окружным колхозсоюзам и кустовым об'единениям колхозов право операционно-хозяйственной деятельности, признав кустовые об'единения колхозов юридическими лицами.

2. Предложить Белколхозсоюзу в течение трех недель подать в Экономическое Совещание проекты необходимых изменений в уставы Белкохозсоюза и окружных колхозсоюзов и проект устава кустовых об'единений колхозов, предусмотрев в этих уставах порядок создания основных и прочих капиталов.

3. Считать необходимым сконцентрировать обслуживание и финансирование крупных колхозов с посевной площадью от 1000 га, кустовых об'единений колхозов с посевной и сенокосной площадью в 1500 га и специальных колхозов (молочно-животноводческих от 500 шт. скота, садово-огородных от 100 га сада или 150 га огорода) в Белколхозсоюзе.

Обязать Белколхозсоюз представлять годовые производственно-финансовые планы и планы строительства указанных колхозов на утверждение СНК не позже 1 мая предыдущего года.

4. Для подготовки специальных кадров квалифицированных агрономов и техников для колхозов, предложить Народному Комиссариату Просвещения в 1929-30 учебном году открыть факультет организации крупного земледелия и колхозного строительства при Белорусской Сельско-Хозяйственной Академии и организовать техникум коллективного земледелия.

5. Поручить Народному Комиссариату Просвещения совместно с Белколхозсоюзом не позже 25 сентября с. г. разработать конкретные мероприятия по укреплению культурной работы в колхозах с тем, чтобы они осуществлялись, начиная с 1929-30 г. и подать на утверждение СНК БССР.

6. Предоставить Белколхозсоюзу право подавать законопроекты непосредственно в законодательные органы БССР.

Вр. исп. обяз. Председателя Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР В. Игнатовский.

г. Минск. 28 сентября 1929 г.

На хлебазагатоўчым фронце

Верасьнёўскі плян хлебазагатовак пад пагрозай зрыву.

(Гомельская округа).

Хлебазагатоўкі ў акрузе разьвіваюцца недастатковым тэмпам. Спажывецкая каапэрацыя за варасень месяц павінна загатовіць 570 тон хлеба, а загатовіла за 10 дзён толькі 45 тон. Гэта складае 8 процантаў месячнага пляну.

Асноўная прычына невыкананьня пляну загатовак—непрыстасаванасьць загатоўчага апарату да выкананьня ўскладзеных на яго заданьняў. У шмат якіх селішчах растлумачальная кампанія аб значэньні здачы каапэрацыі хлебных лішкаў праводзіцца надзвычайна слаба. У некаторых райёнах пляны загатовак яшчэ не даведзены да вёскі.

Райвыканкомы яшчэ да гэтага часу не арганізавалі належнага кантролю за ходам хлебазагатовак. У райёнах ёсьць выпадкі, калі кантрактанты ня поўнасьцю здаюць закантрактаваны хлеб.

Акргандаль даручыў усім загатоўцам прыняць захады да абавязковага выкананьня верасьнёўскага пляну.

В.

Здалі на 40 проц. больш.

Сяляне вёсні Ражанкі, Чарэйскага райёну, Аршанскай акругі, арганізавалі чырвоны абоз з 40 падвод і прывезьлі крэдыт-каапэрацыі закантрактаванае ільна-насеньне. Заданьне свае яны перавысілі на 40 проц.

Г-ч.

Няма тавараў, няма памяшканьня.

У Копыскім спажывецкім таварыстве (Аршаншчына) няма дэфіцытных тавараў, а таму досыць цяжка весьці хлебазагатоўкі. Таксама няма належнага памяшканьня для сыпкі збожжа. Усе склады перапоўнены. Хлебазагатоўчы апарат не клапоціцца аб зьнішчэньні гэтых недахопаў.

М. ГУРЭВІЧ.

Заданьне выканалі на 150 проц.

Сяляне пасёлку і мястэчка Самахвалавіч на агульным сходзе пастанавілі: „Здаць усе лішкі хлеба дзяржаве; ніводнага фунта прыватніку". Бедната першая выканала гэту пастанову. Здала на 50 проц. больш хлеба, чым пастанавіла на сходзе.

П.

Кожны дзень прывозяць хлеб.

Па ўсіх вёсках і пасёлках Урэцкага сельсавету, Слуцкага райёну, праведзены сходы па пытаньню хлебазагатовак. Сяляне ўсюды выносілі пастановы аб калектыўнай здачы лішкаў хлеба. Ня сённішні дзень сельска-гаспадарчая каапэрацыя прыняла ад сялян каля 2000 пудоў збожжа.

МАЛЕР Х.

Жаночы чырвоны абоз.

29 верасьня на склад Смалявіцкага сельска-гаспадарчага таварыства прыбыў чырвоны абоз з вёскі Крывой-Бярозы, арганізаваны жанчынамі. Жанчыны прывезьлі адну тону хлеба.

Апрача гэтага, прыбылі чырвоныя абозы з Варатоўкага, Амельянаўкага, Жажэлкаўкага, Смалявіцкага, Забалоцкага, Плюскага і Аз.-Слабодзкага сельсаветаў. Усяго паступіла 68 тон збожжа.

За ўвесь час сяляніства здало 183 тоны хлеба. Варатоўскі сельсавет ужо выканаў 97 проц. заданьня.

Р. ХАДЫКА.

„Дробязі" перашкаджаюць загатоўкам.

У Вульскім крэдытным таварыстве (Полацкая округа) памяшканьне для семя лёну і іншага збожжа не падрыхтавана; семя лёну сыплюць на памост і яно цячэ на зямлю. Вага стаіць у адным памяшканьні, а ссыпаюць у другім і селяніну прыходзіцца перавозіць збожжа з аднаго месца на другое.

Такое становішча ў Хоцінскім таварыстве: складачныя памяшканьні для збожжа старыя, нама засекаў, семя-лёну ссыпаюць на памост.

Здаецца, дробязі, але ўсё разам перашкаджае нармальнаму ходу хлебазагатовак.

М. ФРОЛАЎ.

Ні тавараў, ні прэміравальнага фонду.

(Халопеніцкі райён, Менскай акр.).

Самым галоўным недахопам у хлебазагатоўках зьяўляецца адсутнасьць ходкіх тавараў, як мануфактура, махорка і інш. Менскае аддзяленьне Белкаапсаюзу да гэтага часу ня выдзеліла фонду для прэміраваньня здатчыкаў хлеба.

В-ч і М-н.

ПЛЯНЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ПОЎНАСЬЦЮ НЯ ВЫКОНВАЮЦЦА.

На мясцох адсутнічае тэхнічнае кіраўніцтва будаўнічымі работамі.

ВАПЕЛЬНІ АРГАНІЗУЮЦЦА БЯЗ ЖАДНАГА ПЛЯНУ.

Будаўнічы плян па лініі каапэрацыі на 1928-29 г. дасягае даволі значных разьмераў. У гэты плян было ўключана: пабудова 3-х крахмальных заводаў, 15 сушыльна-мачыльна-мяльных пунктаў, 22 мачыльныя ямы, 22 сушылкі фруктаў, гародніны, 50 птушнікаў, 11 масларобных; 5 масла-сыразаводаў, фруктова-вінны завод, 63 вапельні, пачатак пабудовы ільнянога камбінату ў Дрысе і інш. Усяго на будаўніцтва розных прадпрыемстваў па лініі каапэрацыі на мінулы год было вызначана 1826500 руб.

Скончыўся гаспадарчы год, а разам з гэтым павінна скончыцца і выкананьне будаўнічага пляну. Аднак, факты гавораць зусім аб іншым. Тут мы сустракаемся з цалым шэрагам праваляў будаўнічага сэзону, са спазьненьнем складаньня праэктаў, неравышэньнем каштарысаў, адсутнасьцю будаўнічай дысцыпліны, невыкананьнем крэдытаў па прызначэньню і г. д. Сушыльна-мяльныя пункты будуюцца толькі ў Полацкай і Віцебскай акругах. У Магілеўскай, Гомельскай і Аршанскай акругах гэта будаўніцтва зусім не разгарнулася. Гэта тлумачыцца спазьненьнем складаньня праэктаў і вызначэньня крэдытаў.

З 22 мачыльных ям, вызначаных па пляну, будуецца толькі 5, а рэшта сёлета ня будуць будавацца.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіцца будаўніцтва іншых відаў прадпрыемстваў па перапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі. На мясцох часта ня лічацца з плянаваньнем у цэнтры. Напрыклад, была вызначана пабудова фрукта-віннага заводу ў Рэчках, Гомельскай акр. Ці будуецца завод у Рэчках, невядома, але затое будуецца завод у Чачэрску, дзе пабудова такога заводу ніколі не меркавалася.

Вялікім недахопам зьяўляецца адсутнасьць у калгассаюзах і наогул па лініі каапэрацыі тэхнічнага кантролю.

Будаўніцтва вядзецца бяз жаднага нагляду, без належнага тэхнічнага кіраўніцтва. Справа тут даходзіць часам да поўнай расхлябанасьці. Гэта можна бачыць хоць-бы з таго, што ў калгасах ня выконваецца плян будаўніцтва фрукта-сушылак. На арганізацыю кожнай такой сушылкі асыгнуецца па 1500 руб., але калгасам сёлета апад выгадней прадаваць, чым сушыць яго. Праўда, налета, калі будзе добры ўраджай садавіны, трэба будзе сушыць яе. Але па гэта не зварачваецца ўвага, крэдыты ідуць на іншыя патрэбы.

З будаўніцтвам Дрысенскага ільнакамбінату, які будзе каштаваць каля 450.000 руб., таксама аначна спазьніліся. З плянам будаўніцтва фруктова-віннага заводу ў Віцебску правазіліся аж да 12-га верасьня, пакуль, нарэшце, абралі месца для яго. З будаўніцтвам кармушкі для курэй выпала яшчэ горш: спачатку запраэктавалі пабудаваць яе ў Менску. Затым перанесьлі ў Барысаў, потым у Воршу, але і тут справа ня выгарэла: у выніку ўсяго гэтага кармушка сёлета ня будзе будавацца. Зусім дрэнна абстаіць справа з устаноўкамі вапельніў. У пачатку лета іх павінна было быць 63, а фактычна да 1-га верасьня існавала толькі 51 вапельня. Не гаворачы аб тым, што вынікла вялікая цяганіна з устаноўкай млыноў, што плян вапнаваньня сарваны, горш тое, што некаторыя вапельні арганізаваны ў такіх мясцох, дзе мала ёсьць вапнякоў, ці дзе яны вельмі глыбока ў зямлі. Замест 2,5 кап. за пуд здабываньне вапны часта абходзіцца ў 5,8—11 кап.

На мясцох справа пастаўлена так дрэнна, што нават тая дробязь, якая ўжо загатоўлена, застаецца ляжаць і не дае магчымасьці весьці далейшую эксплёатацыю вапны. З 16.000 тон вапны разабралі толькі 4000 тон, а рэшта ляжыць не скарыстанай. Зямельныя органы слаба інфармуюць насельніцтва аб задачах і мэтах вапнаваньня.

Трэба таксама шырока завастрыць увагу і на самай канструкцыі вапна-драбілак. За 5 месяцаў працы рамонт вапна-драбілкі абыходзіцца ў 700 руб., у той час, калі сама драбілка каштуе ўсяго 1.500 руб.

Магілеўшчыне з рэалізацыяй пазыкі трэба падцягнуцца.

(З пасяджэньня Цэнтральнай Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе).

Цэнтральная Камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе па дакладах Магілеўскай акруговай і Шклоўскай райённай камісій садзейнічаньня аб распаўсюджваньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі адзначыла, што пры выкананьні агульнай кантрольнай лічбы па акрузе на 113 проц. рэалізацыя пазыкі па Магілеўшчыне праходзіць слаба сярод сялянства і неарганізаванага насельніцтва.

Ёсьць выпадкі, што па некаторых прадпрыемствах і ўстановах рабочыя і служачыя гораду яшчэ дагэтуль не ахоплены падпіскай на поўны месячны заработак. Слаба таксама ў акрузе праходзіць афарміленьне падпіскі на пазыку. Як акруговыя, так і райённыя арганізацыі не правяралі выкананьня дырэктыў, у выніку гэтага райённыя камісіі садзейнічаньня і каапэрацыйныя арганізацыі ня прымаюць належнага ўдзелу ў распаўсюджваньні пазыкі.

Праца па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі ня ўвязваецца з працай за ўтрыманьне на руках аблігацый ранейшых пазык.

Цэнтральная Камісія запрапанавала Магілеўскай акруговай камісіі садзейнічаньня прыняць меры да ўзмацненьня кампаніі па рэалізацыі пазыкі, асабліва сярод сялянства і неарганізаванага насельніцтва. Павінна быць зьвернута ўвага на свечасовае афарміленьне папярэдняй падпіскі. Побач з гэтым запрапанавана для папулярызацыі пазык выкарыстаць тыражы выйгрышаў, якія адбудуцца на тэрыторыі БССР (па пазыцы ўзмацненьня сельскай гаспадаркі ў Полаччыне і па 1-й пазыцы індустрыялізацыі ў Віцебску).

Неабходна прыняць меры да праверкі свечасовасьці здачы адміністрацыяй устаноў і прадпрыемстваў, а таксама і кантрагэнтамі ўзносаў, атрыманых ад падпісчыкаў і вінаватых у несвечасовай здачы прыцягваць да адказнасьці. Дадзена дырэктыва прыняць меры да больш шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва пры прэміраваньне тых адзінак, асабліва калгасаў і саўгасаў, якія добра праводзяць рэалізацыю пазыкі.

Пастаноўлена давесьці да ведама каапэрацыйных цэнтраў, што ўсе віды каапэрацыі Магілеўшчыны ня прымаюць належнага ўдзелу ў кампаніі па распаўсюджваньню пазыкі.

Аб арганізацыі буйнай садова-гароднай малочнай базы.

Менскі акрплян тармозіць ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства.

Менскі камгас распрацоўвае праэкт арганізацыі ў ваколіцах Менску буйнай садова-гароднай малочнай базы на пляцы ў 2500 гэкт. Гэта база-волат павінна ў поўнай меры забясьпечыць горад малаком, гародніной і фруктамі.

Як-жа зараз забясьпечваецца горад гэтымі прадуктамі? Хто зьяўляўся да гэтага часу дастаўшчыком і вытворцам іх? На гэтыя запытаньні можна даць кароткі адказ: у гэтай галіне панае пераважна стыхія прыватніка.

Нашы загатоўчыя арганізацыі, як МЦРК, крэдыт-саюз і інш., атрымліваюць нязначны процант гародніны ад савгасаў, калгасаў і т-ваў, галоўная-ж маса гародніны ідзе ад буйных гароднікаў-прыватнікаў, прычым, каля 40 проц. прывозіцца з іншых райёнаў і нават рэспублік. Тымчасам пры правільнай арганізацыі гародняе справы ў іншых прыгародных савгасах і калгасах можна было-б поўнасьцю забясьпечыць Менск гародніной.

Нашы савгасы і калгасы зараз маюць пад гародамі вельмі нязначную плошчу: 5 савгасаў у 600 гэкт. маюць 16 гэкт. гароду, 5 калгасаў у 400 гэкт.—толькі 5 гэкт. гароду, тымчасам, што каб забясьпечыць горад гародніной, трэба мець пад гародамі 1300 гэкт.

Такі-ж самы малюнак мы маем і з забясьпечаньнем малаком. Запатрабаваньне ў сьвежым малаку дасягае 10000 тон. З гэтае колькасьці да 60 проц. прадукцыі дастаўляецца прыватным рынкам.

Зусім слушна, што тут патрабуюцца нейкія рашучыя мерапрыемствы, каб выйсьці з гэтага цяжкага становішча і забясьпечыць горад усімі патрэбнымі малочнымі і гародніннымі прадуктамі.

Дзеля гэтага намячаецца аб'яднаць усе савгасы і калгасы прыгароднай мяжы. Апроч гэтага, прадбачыцца пашырэньне пляцу савгасаў і калгасаў за кошт аброзкі суседніх хутароў і нават за кошт высяленьня хутарскіх гаспадарак за гарадзкую мяжу.

Узбуйненьня савгасы павінны заняць пляц у 1500 гэкт., каб можна было арганізаваць фэрму на 600 кароў.

Узбуйненыя калгасы таксама павінны павялічыць стада сваіх кароў.

Але зараз паўстала перашкода ў арганізацыйнай працы. Ня гледзячы на поўную пагоджанасьць гэтага пытаньня паміж Менскім АВК, Наркамземам і акрземаддзелам, Менская акруговая плянавая камісія проста марудзіць з гэтай справай, высоўваючы ўсялякія бюракратычныя надыходы. Ужо нават быў заключан дагавор з каморнікамі, якія павінны былі прыступіць да абмеру зямлі, але з прычыны вышэйпададзеных акалічнасьцяў справа ня рухаецца з месца. Тымчасам з пачатку вясны 1930 г. трэба было-б ужо практычна прыступіць да арганізацыі фармаў.

ХРОНІКА.

Рабочыя клюбы— на бесперапынны рабочы тыдзень.

СВАЕЧАСОВА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ЗІМОВАЙ КУЛЬТПРАЦЫ.

Пры культаддзеле ЦСПСБ адбылася нарада загадчыкаў клюбаў і прадстаўнікоў культкамісіі ФЗМК г. Менску на пытаньню аб пераводзе працы клюбаў на бесперапынны рабочы тыдзень і аб мэтадах зімовае культпрацы.

З дакладам выступіў заг. культаддзелу ЦСПСБ тав. Клімковіч, які ахарактарызаваў асноўныя задачы працы клюбаў у сувязі з наступленьнем зімовага сэзону.

У сувязі з пераводам працы фабрык, заводаў і ўстаноў на бесперапынны рабочы тыдзень, клюбы павінны прыстасаваць сваю працу да лепшага абслугоўваньня рабочых. Асаблівая ўвага павінна быць аддана выхаваньню новых кадраў рабочых, узмацненьню інтэрнацыяльнай працы.

Ва ўсёй сыстэме масавай працы трэба адбіваць моманты, зьвязаныя з пераводам нашых устаноў на бесперапынны рабочы тыдзень.

Клюбы павінны адаць шмат увагі палепшанаму абслугоўваньня рабочых, якія працуюць па зьменах і асобных груп, аднолькавых па свайму разьвіцьцю.

Трэба шырока практыкаваць мэтады самадзейнасьці рабочых, наладжваючы дыспуты і гутаркі па пытаньнях, якія больш усяго хвалююць працоўныя масы.

Нарада прыняла пастанову, у якой вызначэцца шлях далейшай працы клюбаў.

Дзеля хутчэйшага пераводу працы клюбаў на бесперапынны тыдзень пастаноўлена пры ўсіх клюбах арганізаваць камісіі садзейнічаньня пераводу.

Завострана ўвага на неабходнасьці ўзмацненьня беларусізацыі рабочых клюбаў праз арганізацыю гурткоў па вывучэньні беларускай мовы, а таксама вечароў беларускай літаратуры з удзелам паэтаў і пісьменьнікаў.

Нарада падкрэсьліла, што клюбы зусім слаба адбіваюць працу „Озета", не папулярызуюць лётэрэі „Озета", якая мае на мэце зямляўпарадкаваньне працоўных яўрэяў.

Для больш дэтальнай распрацоўкі пытаньня аб зімовай культпрацы вылучана дабраахвотная брыгада з 6 чалавек. Таксама вызначана група таварышоў для абсьледаваньня фінансавага становішча некаторых клюбаў і культфондаў ЦП саюзаў.

Зьвярнеце ўвагу на бяспрытульных дзяцей.

Бяспрытульныя зьявіліся неяк раптам. Каля кожнай сталоўкі можна бачыць цэлыя групы бяспрытульных дзяцей. Скуль яны ўзяліся, ніхто дакладна ня можа сказаць. Але яны ня з вёсак, ня з дзіцячых дамоў.

Тэрмін спыненьня вулічнай бяспрытульнасьці даўно ўжо прайшоў. Нягледзячы на гэта, па вуліцах можна спаткаць цэлыя дзесяткі прафэсыяналаў-бяспрытульнікаў. Менакрана спасылаецца на тое, што ў дзіцячых дамох няма месца. Але гэта не адказ. Трэба ўжыць усе захады, каб выявіць усіх бяспрытульных дзяцей. У гэтай справе павінны прыняць актыўны ўдзел нашы грамадзкія арганізацыі і міліцыя.

На дапамогу вёсцы.

Саюз савгандльслужачых накіраваў брыгаду ў вёску для ўдзелу ў працы па падрыхтоўцы і правядзеньню „Дню ўраджаю і калектывізацыі". Апрача таго, у Халопеніцкі і Бярэзінскі райёны пасланы дзеля гэтага па 2-3 чалавекі.

Падрыхтоўка да „Дню ўраджаю і калектывізацыі".

Калгассаюз чыніць рыхтуецца да правядзеньня „Дню ўраджаю і калектывізацыі". У цэлым шэрагу калгасаў будуць арганізаваны сталоўкі, клюбы, чырвоныя куткі, дзіцячыя ясьлі. Дзеля ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў калгассаюз пагадзіў гэтыя пытаньні з Белкаапсаюзам, Нар. Кам. Ах. Зд., Наркамасьветы ды інш., за кошт якіх будуць праводзіцца гэтыя мерапрыемствы.

За павышэньне загатоўчых цэн—да адказнасьці.

За сыстэматычнае павышэньне загатоўчых цэн на жывёлу Самахвалаўскае сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва прыцягваецца да судовай адказнасьці. Справа накіравана пракурору Менскай акругі.

Новая газэта піанэраў і школьнікаў.

Сёньня выходзіць першы нумар двухтыднёвай газэты піанэраў і школьнікаў Беларусі „Піонэр Беларусі".

Акрамя гэтага раз у месяц будзе выдавацца часопіс для дзяцей малодшага ўзросту.

Будзем працаваць у рэлігійныя сьвяты.

Агульны сход рабочых п.-н. „Паліграф" ухваліў не сьвяткаваць яўрэйскіх рэлігійных сьвят, а весьці працу нармальным тэмпам.

Дзень „Ком-Кіпур" (судны дзень) ухвалена адпрацаваць у фонд абароны краіны.

На 4-хмесячных курсах па падрыхтоўцы настаўнікаў.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла працягнуць заняткі на 4-х месячных курсах для падрыхтоўкі настаўнікту да 6-га кастрычніка.

Курсанты будуць разьмеркаваны па акругах БССР.

Трактары для БССР.

БССР атрымлівае з цэнтру дадатковa 50 трактараў, якія будуць адпушчаны ў 4 м. квартале.

Увесну 1930 году БССР атрымлівае 275 трактараў—апошнія будуць адпушчаны з цэнтру ў 2-м і 3-м квартале 1929-30 году.

Да зьніжэньня ставак сац. страхаваньня ў малочнай прамысловасьці.

Сталае прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе СССР адносна праэкту новага закону саюзнага ўраду аб зьніжэньні ставак па сацыяльнаму страхаваньню для прадпрыемстваў малочнай прамысловасьці паведаміла, што яно лічыць немэтазгодным увядзеньне частковага сацыяльнага страхаваньня рабочых і служачых заводаў малочнай прамысловасьці.

Прадстаўнікі Беларусі ў інтарэсах разьвіцьця малочнай прамысловасьці лічаць патрэбным зьнізіць стаўкі сацыяльнага страхаваньня.

Курсы для дэмабілізаваных чырвонаармейцаў.

Галоўная каса ашчаднасьці арганізавала курсы для падрыхтоўкі чырвонаармейцаў якія маюць быць дэмабілізаваны, прапаўнікоў для вясковай сеткі ашчадных кас.

На курсах навучаецца 47 чырвонаармейцаў; выпуск курсаў адбудзецца 15-га кастрычніка.

Посьпехі Дзяржаўнага польскага вандроўнага тэатру.

Дзяржаўны польскі вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам т. Багінскага выяжджаў у Койданоўскі райён, дзе ў розных мясцох правёў 10 пастановак. Ставіліся п'есы: „Мяшчанка", „Не ўдалася", „Магда" і „Чытальня".

Апошні спэктакль быў наладжан у в. Янова за 2 кілёмэтры ад граніцы. Сяляне гэтай вёскі спэцыяльна да спэктаклю пабудавалі на адкрытым месцы сцэну. Усе спэктаклі карысталася вялікім посьпехам.

Зараз калектыў тэатру вярнуўся ў Менск і будзе рыхтаваць новы рэпэртуар. Да 1 студзеня тэатр зробіць выезд на Аршаншчыну і, апрача таго, будзе абслугоўваць польскае насельніцтва г. Менску.

Апарат НКАсьветы—на бесперапынны працоўны тыдзень.

Апарат НКАсьветы пераводзіцца на бесперапынны працоўны тыдзень. Штат не павялічваецца.

Выпуск настаўніцкіх курсаў.

Гэтымі днямі ў Менску адбудзецца выпуск слухачоў чатырохмесячных настаўніцкіх курсаў. Пра курсы прайшло звыш 100 чалавек.

Настаўнікі накіроўваюцца на працу ў розныя райёны Беларусі.

СУД.

Зладзейскае гняздо ў Халопеніцкім райёне.

Халопеніцкі райён заўсёды мае за сабою дрэнную славу. Хто ня памятае банд Моніча, Букаткіна, Семяшока, якія ў свой час наводзілі жах на насельніцтва райёну.

Цяпер пасьля кароткага бандыцкага заціпша над райёнам пранеслася новая навала—сыстэматычная пракража коняй.

Канакрадзтвам, як прафэсыяй, асабліва займаліся гр. вёскі Міхэрына Барыс Аўчыньнікаў і яго сваяк Мікола Ермаковіч, Першы вядомы рэцыдывіст па крымінальных злачынствах.

Некалькі разоў Аўчыньнікаў быў пад судом, адбываў пакараньне, але ніякія меры сацыяльнай абароны на яго ня дзейнічалі.

Разам з сваяком Ермаковічам і пры яго дапамозе Аўчыньнікаў у апошні час зрабіў некалькі пракраж коняй.

17 мая 1928 г. у грам. в. Крупіца Ільлі Хамічэнка быў украдзен конь і праданы гр. Марозу ў Крупскі райён.

У сакавіку 1929 г. у гр. вёскі Прудзен Пятруся Жука з замкнутай пуні была ўкрадзена кабыла, якую Аўчыньнікаў прадаў у м. Чарэі, але яна была затрымана міліцыяй.

У гр. вёскі Ліпавец, Пятруся Меньковскага таксама з пуні быў украдзен конь, а ў гр. вёскі Падавец Алеся Аўдзеенка Аўчыньнікаў украў двое коняй і збыў у м. Чарэю.

За сыстэматычную пракражу коняй народны суд Халопеніцкага райёну прыгаварыў Барыса Аўчыньнікова на восем год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, пазбаўленьнем у правах і высылкай з межаў БССР на тры гады на адбыцьцё пакараньня.

Мікола Ермаковіч засуджан на пяць год зьняволеньня са спагнаньнем з яго і Аўчыньнікава ў карысьць Петры Меньковскага 140 руб. за каня.

Д. К.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 4-е КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.95	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.25	129.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.15	100.55
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.44	25.54
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5. —	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.40	10.75
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.16	25.26
2 „ „ „ проц.	25.25	25.35
2 „ „ „ 6-проц.	25.25	25.35
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.01	101.06
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.09	—

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

СХОД МЕНСКАЙ ФІЛІІ БЕЛАПП.

Сёньня, а 8 гадз. увечары ў вялікай залі Дому Пасьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца агульны сход членаў Менскай філіі БелАПП.

Прысутнасьць усіх членаў філіі абавязкова.

БЮРО ФІЛІІ.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	З панядзелка 30 верасьня. „БЭНЭФІС КЛЁУНА ЖОРЖА" драма ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка «СОВКІНО». Пачатак а 7 гадзіне.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 30-га верасьня. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „СІНІЯ КАЎНЯРЫ" у 5 частках. Звыш праграмы: камэдыя „ЛАСО" у 2-х част. Пачатак а 7 гадзіне
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З ПАНЯДЗЕЛКА, 30-га ВЕРАСЬНЯ. МАСТАЦКАЯ ДРАМА „ЧАЛАВЕК З ПАРТФЭЛЕМ" Пачатак а 7 з пал. гадзіне.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".	2 фільмы вытворчасьці БДкіно. „ДЖЭНТЛЬМЭН І ПЕВЕНЬ" у 6 частках „Бунт зубоў" у 2 частках Пачатак а 3 гадзіне 30 хв. Каса а 2 гадз.

На падставе пастановы ЦВК і СНК СССР ад 4-га верасьня г. г. АБ АБАВЯЗКОВЫМ СТРАХАВАНЬНІ МАЁМАСЬЦІ АБАГУЛЕНАГА СЭКТАРУ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ, УСЯ МАЁМАСЬЦЬ (будынкі, рухомасьць, судны, тавары, жывёла і пасевы), НАЛЕЖАЧЫЯ ЎСІМ КААПЭРАЦЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ (калгасам, с.-г. т-вам, сам.-прам. арцелям, жыльлёвым таварыствам, інваліда., мэліарацыйным, тарпяным, машынным, агнятрывалым, малочным, птушкаводным, рыбацкім і інш.), ЛІЧУЦЦА ЗАСТРАХАВАНЫМІ з 1-га КАСТРЫЧНІКА г. г. У КААПСТРАХСАЮЗЕ і ў выпадку страты ад навальнага ліха, прадугледжанага правіламі страхаваньня, пацярпеўшыя страту каапэрацыйныя арганізацыі маюць права на зварот яе.

Паказаныя вышэй каапарганізацыі ПАВІННЫ з свайго боку зрабіць вучот належачай ім маёмасьці па формах Каапстрахсаюзу. Аб суме налічанай прэміі, парадку і тэрмінах узносу страхавых плацажоў — указаньні будуць даны Агенцтвамі Каапстрахсаюзу ў бліжэйшым часе.

БЕЛКААПСТРАХАГЕНЦТВА.

Нарсуд Чырвона-Слабодзкага райёну, Бабруйскай акругі, на падставе прысуду ад 20 жніўня 1929 г. 1 арт. 131 КК (за самаўпраўства) абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне СЕЧКО ПілІпу Міхасёву, 36 г., бядняк, мыхар пасёлка Дошнава, Жыва́глодаўскага сельсавету.

Нарсуд Хо[illegible]цкага райёну, Гомельскай акругі, м. Хойнікі, на падставе прысуду за 1929 г., чэрвеня 11 дня, і арт. 196 і 231-а КК за надбайныя адносіны да службовых абавязкаў, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. ГУРЗВІЧ Д. Е., доктару Хойніцкай сан. бальніцы.

Нарсуд Чырвона-Слабодзкага райёну, Бабруйскай акругі, на падставе прысуду ад 13 жніўня 1929 г. 1 арт. 237 КК (за абражаньне) Ракуцько Мікалая Арцёмава абвяшчае грамадзянскае ганьбаваньне ВЯРБІЦКАЙ Акуліне Пракопавай 60 г. серадняцка, сялянка вас. Новае-Жыва́глодавічы, Жыва́глодаўскага сельсавету.

Нарсуд Чырвона-Слабодзкага райёну, Бабруйскай акругі, на падставе прысуду ад 20 жніўня 1929 г. 1 арт. 239-а КК (за распаўсюджваньне заведама неправяўдивых слухаў) супроць Чыгір Вольні Самёнавай, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне КАНАПЛЯНЬНІК Мар'і Васілеваі, селянка вас. Маліна, Старчыцкага сельсавету.

Народны суд Жыткавіцкага раёну Мазырскай акругі на падставе прысуду ад 19 ліпеня 1929 г. па 196 і 213 арт. Кр. Код., гэта значыць за надбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў, за парубку ў яго абходзе лесу невядомымі ліцамі, якой ён як лясны вартаўнік не абнаружыў да часу рэвізіі абходу і ня выявіў парубшчыкаў; абвешчана грамадзкае ганьбаваньне гр. Касабуцкаму Адаму Зьмітраву з вёскі Вятчыны Жыткавіцкага раёну, служачаму вартаўніком у Вятчынскім Лясьніцтве, Мазырскай акругі.

Нарсуд Чырвона-Слабодзкага райёну, Бабруйскай акругі, на падставе прысуду ад 24 жніўня 1929 г. 1 арт. 196 з санкцыяй 213 КК